Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
1 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. СЕРАДА № 186 (27796) Кошт 1800 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Зямля даражэйшая за нафту?**

СТАР. 3



**Дзе прычаліў карабель вікінгаў?**

СТАР. 4



**Стараста вырашыць усе праблемы**

■ Узровень

## ФОРУМ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы адбудзецца адкрыццё III з'езда настаўнікаў і работнікаў адукацыі дзяржаў СНД. Для ўдзелу ў з'ездзе ў Мінск з'ехаліся педагогі, выхавальнікі дашкольных устаноў, кіраўнікі ўстаноў адукацыі і выдавецтваў, якія працуюць у сферы адукацыі і навукі, метадысты, прадстаўнікі міждзяржаўных і міжурадавых арганізацый краін Садружнасці, парламентарыі, палітыкі, відныя дзеячы навукі, адукацыі і культуры. У цэнтры ўвагі дэлегатаў з'езда акажуцца праблемы якасці агульнай сярэдняй адукацыі і падрыхтоўкі педагагічных кадраў, эфектыўныя адукацыйныя тэхналогіі і нацыянальныя сістэмы ацэньвання, пытанні прафесіянальнай кампетэнтнасці педагогаў і менеджменту ў адукацыі, сацыялізацыі і інтэграцыі ў грамадства дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Як паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітальнае слова ўдзельнікам з'езда.

«Правядзенне такіх форумаў ужо стала добрай традыцыяй і сведчаннем высокага статусу вашай прафесіі ў грамадстве, прызнання выключнай ролі настаўніка ў выхаванні падрастаючага пакалення, — падкрэсліваецца ў прывітанні. — У нашы дні менавіта веды дапамагаюць маладому чалавеку знайсці дастойнае месца ў жыцці і прадуктыўна працаваць на карысць сваёй сям'і і роднай краіны. Таму такая вялікая ўвага надаецца вашаму прафесійнаму майстэрству, уменню зацікавіць і захапіць вучняў, прымяняць самыя сучасныя метадычныя прыёмы і ўласныя распрацоўкі».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што з'езд прадаставіць яго ўдзельнікам магчымасць для абмену вопытам і свежымі ідэямі, а яго вынікі дадуць новы імпульс развіццю плённага супрацоўніцтва педагогаў краін Садружнасці.

■ Парламенцкі дзённік

## ПРОСТЫХ ЗАКОНАПРАЕКТАЎ НЕ БУДЗЕ

**Чарговая парламенцкая сесія будзе дастаткова напружанай: ужо зараз на разглядзе знаходзіцца каля 60 пытанняў. Гэта адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас пасяджэння Савета ніжняй палаты беларускага парламента.**

Ён нагадаў, што многія з тых праектаў законаў, якія запланаваны на восеньскую сесію, дастаткова няпростыя. Парламентарыі працавалі разам з урадам, экспертамі. Асобныя законапраекты праходзілі шырокае грамадскае абмеркаванне. Па некаторых законах прасілі парады ў Прэзідэнта.

— Важнай падзеяй стала сустрэча членаў Палаты прадстаўнікоў з Прэзідэнтам, на якой былі вызначаны прыярытэтныя кірункі працы парламента, — заўважыў Уладзімір Андрэйчанка. — Натуральна, што ў цэнтры ўвагі Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі ў бліжэйшы час стане законапраект «Аб бюджэце на 2015 год». Прэзідэнт прасіў вельмі ўважліва падысці да гэтага пытання і звяртаць увагу не толькі на расходы, але і на крыніцы папаўнення даходаў. Траціць трэба на самае неабходнае, на тое, што заўтра прынясе аддачу.

Як падкрэсліў старшыня Палаты прадстаўнікоў, важным дакументам стане і дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе.

— Яшчэ сёння застаецца шэраг пытанняў, якія патрабуецца сур'ёзна разгледзець, перш чым прыступіць да ратыфікацыі. Але думаю, што ў бліжэйшы час мы павінны іх ратыфікаваць.

Простых законапраектаў, па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, на гэтай сесіі не будзе. У планах — разгледзець законапраекты аб каштоўных паперах, аб энергазберажэнні, аб узмацненні мер адказнасці за выраб наркатычных сродкаў, прыняць змены і дапаўненні ў Крымінальны і Лясны кодэксы... На гэтай жа сесіі пройдуць парламенцкія слуханні аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве.

**Аляксандр ГРЫЦКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце**, удакладніў, што 35 законапраектаў ужо цалкам гатовы да разгляду на восеньскай сесіі і ўключаны ў яе парадак. З іх плануецца разгледзець 13 праектаў закона ў першым чытанні, 9 — у другім, 12 з'яўляюцца ратыфікацыямі міжнародных пагадненняў. Па словах Аляксандра Грыцкевіча, традыцыйна ў парадак уключаюцца кадравыя пытанні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**2 кастрычніка 2014 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца адкрыццё шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

# СТАРТЫ НАДЗЕЙ



Фота БЕЛТА.

*Нядаўна ў Хойніках быў праведзены капітальны рамонт гарадскога стадыёна і будынка фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Цяпер аматары спорту і здаровага ладу жыцця з задавальненнем прыходзяць на трэніроўкі. Як, напрыклад, гэтыя юныя лёгкаатлеты з раённай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы, якія, магчыма, праз колькі гадоў стануць чэмпіёнамі...*

*ЛІЧБА ДНЯ*

**7**

**зборачных вытворчасцяў**

***беларускіх прадпрыемстваў плануецца адкрыць да канца 2014 года за мяжой. Гаворка ідзе аб праектах у Расіі адкрытых акцыянерных таварыстваў «Гомсельмаш» і «Гомельскі завод ліцця і нармаляў», а таксама «МТЗ» — у Казахстане і Рэспубліцы Шры-Ланка. Гэтыя прадпрыемствы маюць намер наладзіць па дзве зборачныя вытворчасці. Акрамя таго, ААТ «Бабруйскаграмаш» разлічвае прыступіць да зборкі тэхнікі ў Казахстане. Прапрацоўваецца і пытанне стварэння зборачных вытворчасцяў трактароў МТЗ і камбайнаў «Гомсельмаш» у Кітаі, а таксама тэхнікі МАЗ у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы. Акрамя таго, актыўна праводзіцца работа па стварэнні прадстаўніцтваў за мяжой Мінскага трактарнага завода ў Бразіліі, Егіпце, Пакістане. МАЗ вядзе аналагічную працу ў Бахрэйне, Эквадоры, Конга, Манголіі.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.10.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10590,00 | ▲ |
| Еўра | 13430,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 269,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 817,76 | ▲ |

■ Сацыяльны клопат

## ПАСЛЯ 60 ЖЫЦЦЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА?

### Амаль 700 пар за год пабраліся шлюбам у пенсійным узросце

**Сёння ў свеце традыцыйна адзначаецца Міжнародны дзень пажылых людзей. «Звязда» пацікавілася, колькі ў Беларусі людзей, якія належаць да старэйшага пакалення, і якія новыя падыходы ў арганізацыі іх жыцця ўкараняюцца ў краіне.**

**АМАЛЬ КОЖНЫ ПЯТЫ БЕЛАРУС СТАРЭЙШЫ ЗА 60 ГАДОЎ**

Да ліку пажылых людзей адносяцца людзі ва ўзросце 60 гадоў і старэй. Як паведамілі «Звяздзе» ў Нацыянальным статыстычным камітэце, на пачатак 2014 года ў краіне пражывала 1 879,9 тыс. чалавек гэтай узроставай катэгорыі, або 19,9% ад агульнай колькасці насельніцтва краіны. Усяго за апошнія дзесяць гадоў колькасць пажылых людзей у нас павялічылася на 74,8 тыс. чалавек, або на 4,2%. Па даных на 1 ліпеня гэтага года, 557 беларусаў дасягнулі ўзросту ста і больш гадоў.

У агульнай колькасці пажылых людзей жанчын на пачатак гэтага года было 1 224,6 тыс. чалавек. Мужчын практычна ўдвая менш — усяго 655,3 тыс. чалавек.

Паводле звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі, у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў жніўні гэтага года на ўліку стаяла 2 549,6 тыс. пенсіянераў, з якіх 2 084,2 тыс. чалавек (81,7%) — атрымальнікі пенсій па ўзросце.

Многія пажылыя людзі і на пенсіі хочуць жыць паўнакроўным жыццём. Так, узрост не з'яўляецца перашкодай для стварэння сям'і. Летась у нашай краіне былі заключаны 684 шлюбы, у якіх муж і жонка ва ўзросце 60 гадоў і старэй. Усяго ў 2013 годзе 896 жанчын пажылога ўзросту ўступілі ў шлюб, жаніхамі сталі 1433 мужчыны.

СТАР. 2



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Праблемы адукацыі: грамадская дыскусія

## ІМІДЖ НАСТАЎНІКА,

### або Як прыцягнуць на педагагічныя спецыяльнасці лепшых

**Установіць адказнасць заказчыкаў педагагічных кадраў за замацаванне маладых спецыялістаў на месцах прапанаваў віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль ТОЗІК. Днямі ў сценах Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта прайшло пасяджэнне рабочай групы па комплексным аналізе сістэмы адукацыі, прысвечанае праблемам падрыхтоўкі педагагічных кадраў у краіне.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Колькі часу ў нас будзе дзейнічаць прынцып: «Гэтыя педагогі з'едуць — накірую заяўку і нам прышлюць новых»? — запытаўся ў прысутных Анатоль Тозік. — Прапаную ўвесці жорсткі парадак пры размеркаванні выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў: напрыклад, не разглядаць заяўкі з рэгіёнаў, дзе больш за 40% маладых спецыялістаў з'язджаюць пасля абавязковай адпрацоўкі. Няхай кіраўнік раёна вырашае кадравую праблему самастойна — накіроўвае маладых людзей на мэтавую падрыхтоўку, рыхтуе спецыяліста за кошт сродкаў раённага бюджэту або прыцягвае спецыялістаў з іншых рэгіёнаў...

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Улады Іспаніі знайшлі спосаб адкласці рэферэндум у Каталоніі



Канстытуцыйны суд Іспаніі сабраўся на экстраннае пленарнае пасяджэнне, каб прыняць рашэнне абісках урада краіны, які лічыць неадпаведнымі іспанскай канстытуцыі закон аб правядзенні рэферэндуму ў Каталоніі і закон аб апытаннях. У выніку інстанцыя прыняла іскі да разгляду, што азначае аўтаматычнае прыпыненне дзеяння вышэйпералічаных законаў. Такім чынам, рэферэндум, прызначаны ўладамі Каталоніі на 9 лістапада, адкладваецца, паведамляе El Mundo. Паводле асноўнага закона Іспаніі, дзеянне законаў замарожана на пяць месяцаў. Калі на працягу гэтага перыяду Канстытуцыйны суд не прыме рашэнне, гэты тэрмін можа быць прадоўжаны. Старшыня ўрада аўтаномнай Каталоніі Артур Мас назваў «варожым» рашэнне іспанскіх улад.



### Тэрмін закрыцця Ігналінскай АЭС прадоўжаны да 2038 года

Тэрмін закрыцця Ігналінскай АЭС у Літве будзе прадоўжаны на дзевяць гадоў — да 2038-га. На закрыццё аб'екта спатрэбіцца як мінімум 2,6 млрд еўра. Гэта прадугледжана новым канчатковым планам спынення эксплуатацыі Ігналінскай АЭС. Адзначаецца, што ранейшы тэрмін закрыцця аб'екта (да 2029) не будзе дасягнуты, паколькі спазняецца падрыхтоўка праекта часовага сховішча выкарыстанага ядзернага паліва, з-за чаго будуць мяняцца і графікі выгрузкі паліва з рэактараў і басейнаў. Кошт закрыцця АЭС пры апошніх разліках быў павялічаны амаль удвая — з 1,24 млрд еўра да 2,6 млрд. Першы блок ІАЭС быў спынены 31 снежня 2004 года. Да 2038 года тэрыторыя ІАЭС павінна быць прыстасавана для іншай гаспадарчай дзейнасці.

### ААН налічыла 300 тысяч вымушаных перасяленцаў ва Украіне

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый налічыла ва Украіне амаль 300 тысяч вымушаных перасяленцаў з зоны ваеннага канфлікту. Адпаведная справаздача прадстаўлена на сайце Цэнтра навін ААН. Па даных арганізацыі, у зоне канфлікту цяпер пражываюць каля пяці мільёнаў чалавек. Жыхары ўсходу Украіны маюць вялікую патрэбу ў харчаванні і медыкаментах; амаль ва ўсім рэгіёне няма прымальных санітарных умоў.

ISSN 1990 - 763X
14186>
9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Дзікіх жывёл стала ўдвая менш

Колькасць дзікіх жывёл на Зямлі за апошнія 40 гадоў скарацілася ўдвая. Гэта адна з цэнтральных высноў справаздачы Сусветнага фонду дзікай прыроды (WWF) «Жывая планета» — адной з самых цытуемых у свеце крыніц аб біялагічным стане Зямлі. Эксперты адзначаюць, што для ўзнаўлення рэсурсаў прыроды, якія чалавецтва спажывае штогод, неабходна паўтары планеты. Аўтары справаздачы падлічылі, што калі б кожны зямлянін спажываў столькі, колькі сярэдні жыхар Кувейта, то чалавецтву спатрэбілася б каля 5,8 планеты, як тыповы амерыканец — 3,9 планеты, як расіянін — больш за 2 планеты. Разам з тым, такія краіны, як Узбекістан і Алжыр, жывуць у адпаведнасці з сённяшнімі магчымасцямі Зямлі, а жыхары Арменіі, Інданезіі, Перу, Марока і іншых дзяржаў спажываюць нават менш, чым дае планета.

КОРАТКА

**У беларускіх здраўніцах у студзені—жніўні гэтага года адпачылі і падлячыліся 159,5 тыс. замежных грамадзян з блізкага і далёкага замежжа.**

У адпаведнасці з палажэннямі Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе (ДЗУСЕ) з 29 верасня па 3 кастрычніка 2014 года Італія інспектуе Узброеныя Сілы Беларусі. Мэта інспекцыі — праверка адпаведнасці наяўнасці абмяжоўваемых ДЗУСЕ ўзбраенняў і ваеннай тэхнікі іх паведамленай колькасці.

**Новы для Беларусі від птушак — пеначка-зарнічка — выяўлены ў вёсцы Сасновы Бор Расонскага раёна Віцебскай вобласці. Цяпер у Беларусі зарэгістраваны чатыры віды пеначак: пеначка-трашчотка, пеначка-цянькоўка, пеначка-вяснічка і зялёная пеначка.**

Экспарт беларускай пладова-ягаднай прадукцыі ў гэтым сезоне вырас у 2,5 раза ў параўнанні з мінулым годам і склаў амаль 8 тыс. т.

■ Ведай нашых!

## Крысціна СТАРАСЕЛЕЦ:

## «Я НЕ ЛЮБЛЮ, КАЛІ МЯНЕ ПАРАЎНОЎВАЮЦЬ З КАРСТЭН...»



Фота Надзеі БУЖАН.

**Узыходзячая зорка беларускага спорту брастаўчанка Крысціна Стараселец сёлета толькі і робіць, што збірае медалі. Спачатку яна стала чэмпіёнкай Еўропы па акадэмічным веславанні сярод юніёраў, пазней прынесла першае «золата» камандзе на другіх летніх юнацкіх Алімпійскіх гульнях у Нанкіне. Вярнуўшыся на радзіму, сабрала медалі ўсіх вартасцяў на Кубку Беларусі. А на юнацкім чэмпіянаце свету ў Францыі заваявала серабро. Карэспандэнту «Звязды» Крысціна распавяла пра тое, як трапіла ў акадэмічнае веславанне, хто прывёў яе да перамогі, і пра свае захапленні: вышыванне, шопінг і прагляд фільмаў з любімым... сабакам.**

Мы сустрэліся з Крысцінай раніцай выхаднога дня ў адным з самых спартыўных раёнаў сталіцы: каля «Мінск-Арэны». Дзяўчына спяшаецца ў гандлёвы цэнтр, які знаходзіцца непадалёк, але з задавальненнем і вельмі смела адказвае на ўсе пытанні. Відаць, што пасля нядаўняга поспеху маладая спартсменка ўжо прывыкла да ўвагі з боку журналістаў, і гэта яе ні кропелькі не бянтэжыць.

— Першы час я вельмі нервавалася, асабліва калі мяне здымала відэакамера. Баялася камусьці паказацца не вельмі разумнай ці сказаць што-небудзь не так. І, думаю, гэта было відаць з боку. Адразу пасля перамогі сталі паступаць званкі ў Нанкін, я ў той дзень і так была вельмі стомленая, а яшчэ столькі пытанняў. Было вельмі складана. Увага застаецца і да гэтага часу: шмат званкоў, інтэрв'ю. Здаецца, што я ўжо ўсё расказала, але — не. У гэтым журналістам са мной, напэўна, пашанцавала, таму што, калі я нервуюся, шмат гавару.

СТАР. 6

■ Жыццёвы лад

# УСЮДЫ ПАТРЭБНЫ ГАСПАДАР

## Адкуль бярэцца разруха, высвятлялі ў Мінскай вобласці

**Шчыра кажучы, перыядычна ўзнікала адчуванне, што патрапіў у школьны клас, дзе настаўнік выхоўваў вучняў. Можа быць, таму, што першым прыпынкам па дарозе была школа.
А можа таму, што некаторыя ўдзельнікі выязнога пасяджэння Мінскага аблвыканкама часам паводзілі сябе як школьнікі.
І старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра калі-нікалі рабіў кіраўнікам заўвагі.**



Сямён Шапіра расказвае пра гаспадарку Уладзіміра Радзевіча.

### ЯК ХОДЗІМ — ТАК І ПРАЦУЕМ

Парадак дня пасяджэння складаўся з двух сур'ёзных пытанняў: гатоўнасць народна-гаспадарчага комплексу вобласці да ацяпляльнага сезона, а таксама навядзенне парадку на зямлі і добраўпарадкаванне населеных пунктаў. Пачалі з добраўпарадкавання і заехалі ў сярэднюю школу №1 г. Фаніпаля.

Выдатны стан школьнай тэрыторыі і самога будынка ўразіў. Дарэчы, у школе за апошнія пару месяцаў адрамантавалі 8 кабінетаў гаспадарчым спосабам. Гэтую навучальную ўстанову Сямён Шапіра кіраўнікам раёнаў паставіў у прыклад:

— Але так шмат не трэба адразу рабіць. Адзін кабінет у месяц — і за тры гады школа будзе адрамантавана. Але пры гэтым варта эканоміць кожную капейку, — сказаў ён.

Тут некалькі чалавек замарудзіліся, праходзячы ў кабінет, дзе дырэктар школы Ганна Халапіца расказвала аб сваіх дасягненнях.

— Вы чаго так марудна ходзіце?, — спытаў іх кіраўнік аблвыканкама. — Як ходзім — так і працуем. І чаму не слухаеце, калі вам чалавек распавядае? Вы ж як дзеці... А потым здзіўляемся таму, што салому віламі грузім.

Далей заехалі ў раённы цэнтр.

— Усе гарады ў нас у нечым падобныя. Атрымаў старшыня райвыканкама 100 мільярдаў рублёў з абласнога бюджэту — зрабіў бардзюры, плітку, пераклаў асфальт, — быццам пахваліў кіраўніка Сямён Шапіра і працягваў: — А цяпер паглядзіце: вунь ідуць правады над дрэвамі. І дрэвы зрэзалі напалову. Што гэта такое? Правады было складана перакласці? Трэба будзе цяпер паднімаць асфальт і плітку, каб пакласці кабель пад зямлёю... На месцах не я галоўны, а вы. І менавіта вы павінны вырашаць тут усе пытанні, не чакаючы нейкіх даручэнняў. У кожным раёне павінен быць гаспадар.

### ФЕРМЕРАЎ ПАДТРЫМАЮЦЬ

Пасля гэтага маршрут трохі змянілі. Заехалі ў фермерскую гаспадарку «Сула». Дырэктар Уладзімір Радзевіч за тузін гадоў стварыў тут выдатнае прадпрыемства.

— Вунь стаіць машына з Піцера. Ён возіць туды бульбу. І прадае прадукцыі больш, чым некаторыя СВК. А ў яго толькі 300 га зямлі. У нас ёсць гаспадаркі, дзе мы атрымліваем максімум па 80 цэнтнераў бульбы з гектара. А ў яго палі па 600 цэнтнераў даюць. І людзі сюды ідуць працаваць не пад палкай, як у калгас, а з-за высокага заробку, — сказаў старшыня аблвыканкама.

А Уладзімір Радзевіч, які зусім не разгубіўся ад прыезду дэлегацыі, бо ў яго заўсёды парадак, дадаў:

— Мы выкарыстоўваем нямецкую і беларускую селекцыю і выбіраем толькі лепшыя гатункі, якія запатрабаваны на расійскім рынку. Асноўныя пакупнікі — Санкт-Пецярбург, Масква, Стаўрапаль і Краснадар. 60% сёлета ў нас насенных участкаў. Усе яны былі замоўлены расійскім бокам. Асноўны спажывец — Кубань, Растоў, Валгаград, Ніжні Ноўгарад. У Беларусі купілі 80 тон насення. Але гэта ў асноўным фермеры, якія ведаюць, як зарабіць грошы.

А яшчэ ён збіраецца будаваць новае сховішча і закупляць абсталяванне для мыцця, сушкі і ўпакоўкі бульбы. Яна будзе як у еўрапейскіх крамах. Уладзімір зарабляе на гэтай зямлі грошы. А тут не самыя лепшыя землі — пясочак. Мы павінны падтрымліваць фермераў. Калі нехта мне скажа, што фермеру не далі зямлі, то буду разбірацца асабіста, — папярэдзіў губернатар. — Чым больш мы будзем дапамагаць такім людзям, тым менш будзе ў нас праблем.

### СТРАТЫ — У ПРЫБЫТАК

На Навасвержанскі лесазавод у Стаўбцоўскім раёне два гады таму страшна было паглядзець. Аднак пасля з'яўлення новага кіраўніка ўсё мяняецца літаральна на вачах — наводзіцца парадак. «Усё залежыць ад кіраўнікоў, — зноў нагадаў губернатар. — З'явіўся і парадак, і прыбытак. Дошкі пайшлі ўжо на экспарт». Васіль Дзейчык, дырэктар прадпрыемства, удакладніў:

— У 2012 годзе страты складалі 1 млрд 132 млн рублёў. А сёлета ўжо 2 млрд чыстага прыбытку. Стварылі ўмовы калектыву для працы. Узялі крэдыт і выплацілі зарплату. Людзі нам паверылі. У выніку павысілася прадукцыйнасць працы. І цяпер прадаём прадукцыю ў Галандыю, Бельгію, Германію.

Сямён Шапіра паклікаў бліжэй кіраўніка аднаго з раёнаў.

— Раскажы, як чалавек паднімаў прадпрыемства?

Той разгубіўся. Апусціў галаву, як школьнік, і сказаў:

— Я не слухаў.

— Ты ж малады. Чаго табе слухаць нейкую лухту, так? Ты вось расказваеш, як гераічна працуеш, а ў тваім раёне зашмат праблем. Пры гэтым ніякага інтарэсу да выступоўцы ў цябе няма. І так паводзіш сябе не ты адзін...

### УКЛЮЧЫЦЬ АЦЯПЛЕННЕ ГАТОВЫ ЎЖО ЗАРАЗ

Адным словам, уся паездка стала суцэльным прыкладам, як трэба рабіць і як не. Будзем спадзявацца, што гэта паспрыяе навядзенню парадку паўсюль. Як лічыў вядомы літаратурны герой, «разруха не ў клазетах, а ў галовах». Бо што казаць, калі не выконваюцца планы па выкарыстанні аб'ектаў, якія не эксплуатуюцца, — іх рэканструкцыі, кансервацыі, зносе або падрыхтоўцы да продажу. І нават пасля зносу збудаванняў вызваленыя землі не прыцягваюцца ў сельскагаспадарчы абарот. Акрамя таго, пастаянна выдаюцца прадпісанні, складаюцца пратаколы, накладаюцца штрафы з-за непрыняцця захадаў па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага і сумніку канадскага.

А вось у камунальнай гаспадарцы ўсё больш-менш прыведзена да ладу. Генеральны дырэктар ЖКГ Мінскай вобласці Ігар Дзялендзік заявіў, што вялікіх пытанняў па пачатку ацяпляльнага сезона няма. «Ёсць запасы паліва. Калі тэмпература будзе на працягу пяці дзён ніжэй за восем градусаў, мы ўключым ацяпленне адразу».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара.**

*Дзяржынскі, Стаўбцоўскі раёны*

■

# ПАСЛЯ 60 ЖЫЦЦЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА?

### НАРАДЖЭННЕ РЫНКУ САЦЫЯЛЬНЫХ ПАСЛУГ

Насельніцтва нашай краіны імкліва старэе. Па прагнозах спецыялістаў, у 2015 годзе доля пажылых людзей у структуры насельніцтва Беларусі павінна дасягнуць 25%. І трэба будзе ўлічваць гэта і шукаць новыя падыходы ў арганізацыі жыцця старэйшага пакалення.

Калі паглядзець, як арганізавана жыццё пажылых людзей у эканамічна развітых краінах, то акажацца, што іх сацыяльнае абслугоўванне ажыццяўляецца як праз сістэму дзяржустаноў, так і недзяржаўнымі арганізацыямі.Так, у Германіі сёння больш за 60% інтэрнатаў для інвалідаў з'яўляюцца недзяржаўнымі, прыблізна 50% дамоў састарэлых і 40% бальніц — таксама. Важную ролю ў сацыяльным абслугоўванні грамадзян адыгрываюць добраахвотныя аб'яднанні. А, напрыклад, у Фінляндыі каля 75% паслуг па сацыяльным абслугоўванні пажылых людзей прадастаўляюць муніцыпалітэты, 25% — прыватныя арганізацыі і ўстановы. У Швецыі грамадскія арганізацыі займаюцца такімі сацыяльнымі паслугамі, як дапамога на даму пажылым і інвалідам, догляд дзяцей. У Вялікабрытаніі грамадскія арганізацыі ўдзельнічаюць у стварэнні дамоў-інтэрнатаў для пажылых грамадзян і інвалідаў.

У нашай краіне таксама пачаў зараджацца рынак сацыяльных паслуг. Пра гэта сведчыць укараненне дзяржаўнага сацыяльнага заказу ў сацыяльным абслугоўванні. Гэта дазваляе прыцягнуць у сістэму сацыяльнага абслугоўвання некамерцыйныя арганізацыі.

Сёння ў нас функцыянуюць каля 2,2 тыс. грамадскіх аб'яднанняў рэспубліканскага і рэгіянальнага ўзроўняў. Чаму б не прыцягнуць іх патэнцыял? Гэта дасць магчымасць павысіць даступнасць і якасць сацыяльных паслуг, разнастаіць формы сацыяльнай работы з насельніцтвам. 260 грамадскіх арганізацый, па інфармацыі Мінпрацы і сацабароны, ужо займаюцца аказаннем дапамогі пажылым людзям, але асноўная колькасць дагавораў пакуль заключана з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа.

Акрамя таго, Мінпрацы і сацабароны, дзяржава ў цэлым зацікаўлена ў пашырэнні сеткі прыватных інтэрнатаў з беларускім ці замежным капіталам. Пра гэта ўжо неаднаразова заяўляла, у прыватнасці, міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна. Сёння ва ўсіх рэгіёнах краіны, а таксама ў Рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы ажыццяўляецца сацыяльнае абслугоўванне пажылых людзей у аддзяленнях павышанай камфортнасці. Зараз у такіх аддзяленнях пражываюць больш за 100 чалавек. Сярэдні кошт аплаты такой паслугі — каля 6 млн рублёў у месяц. Пачынаючы з 2012 года, па ўсёй краіне прадастаўляецца таксама паслуга кароткатэрміновага — да 1 месяца — пражывання для тых, хто мае патрэбу ў доглядзе, у дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## • Мы спыталі:

### ЧАМУ ВЫ НАВУЧЫЛІСЯ ПАСЛЯ 60 ГАДОЎ?

***З выхадам на пенсію жыццё не заканчваецца. Яно працягвае здзіўляць, захапляць і натхняць, калі вы здольны здзіўляцца, захапляцца і натхняцца. Усё залежыць ад таго, што ў вашай душы. Мы спыталі ў мінчан: «Чаму вы навучыліся пасля 60 гадоў?» Вось іх адказы.***



**Леанід Шчамялёў, 91 год, мастак:**

Я і зараз раблю тое самае, што рабіў і ў 30, і ў 40, і ў 50 гадоў, але з большым разуменнем таго, чым займаюся, для чаго і для каго. Я заўсёды, усё жыццё бачыў тое, што мне здавалася прыгожым, і адлюстроўваў гэта. Але ў працэсе работы кожнае палатно, кожная карціна праяўляе нешта новае — гэта трымаецца на тым, як ты разумееш сутнасць прыгожага. Вялікае мастацтва раней стваралася гадамі, каласальных вынікаў мастак мог дасягнуць і ў 95 гадоў. Мастацтва патрабуе працяглай працы, паступовага развіцця.



**Людміла Вялічка, 63 гады:**

Я ўсё жыццё працавала праграмістам, таму мой мозг і цяпер на ўзроўні сучасных патрабаванняў. Прыехала ў Мінск па размеркаванні пасля Ленінградскага інстытута 40 гадоў таму і ўсё жыццё прапрацавала ў Гідраметэацэнтры — займалася разлікам прагнозу надвор'я з дапамогай вылічальнай тэхнікі.

Я лічу, што чалавеку трэба пастаянна самаўдасканальвацца, а не чакаць, калі яго возьмуць за руку і адправяць на курсы. Самому трэба вучыцца — у тых, хто гэтага не любіць, жыццё складаецца сумна.

Пайшла на пенсію я ў 61 год. І, паколькі мой мозг пластычны і прывык увесь час працаваць, я стала вывучаць гісторыю нашай цывілізацыі, пачынаючы са Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма, праблемы Усходу і Захаду... Раней ніколі не было часу на гэта. А яшчэ пасля 60 я захапілася фатаграфіяй. Да гэтага таксама раней рукі не даходзілі, а цяпер у мяне пасля кожнай паездкі — сотні здымкаў.



**Валянціна Макоўская, 81 год:**

Пасля шасцідзесяці я стала добрай гаспадыняй: пачала гатаваць больш складаныя стравы, навучылася добра шыць, вязаць. Раней на гэта проста не было часу. Вядома, у мяне была сям'я (муж і двое дзяцей), і я, як любая гаспадыня, гатавала, але калі выйшла на пенсію, стала вывучаць рэцэпты і навучылася гатаваць шмат новых страў. Потым муж пабудаваў дачу, і я стала займацца ёю: вырошчваць там кветкі, зеляніну, варыць варэнне. У гэтым годзе нават бульбу пасадзіла!

А яшчэ я пасля выхаду на пенсію пачала займацца грамадскай працай. І ўжо 15 гадоў з'яўляюся старшынёй клуба пажылых людзей «У гасцях у бабуль» у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Цэнтральнага раёна г. Мінска. Мы сустракаемся ў клубе, дзелімся вопытам, прыносім часопісы, разам абмяркоўваем розныя пытанні, займаемся рукадзеллем, п'ём гарбату... Абавязкова разам адзначаем святы. Мне сумаваць няма калі! Некаторыя мае сяброўкі сталі вучыцца працаваць на камп'ютары. І я, магчыма, таксама займуся гэтым.

**Святлана БУСЬКО.**

# ІМІДЖ НАСТАЎНІКА...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Намеснік прэм'ер-міністра прапанаваў падумаць над рэзкім скарачэннем набору на платную форму навучання на педагагічных спецыяльнасцях, а таксама над скарачэннем набору на бюджэтныя месцы.

— У пачатку 1990-х гадоў у нас было 1,5 мільёна школьнікаў, а мы выпускалі штогод каля 5 тысяч маладых педагогаў. Зараз школьнікаў у нас каля 930 тысяч, а мы выпускаем 10 тысяч педагогаў. Дзе логіка? Прычым прыкладна палова ад гэтай колькасці — студэнты платнай формы навучання. Па нашых прагнозах, кошт падрыхтоўкі аднаго студэнта ў 2014/2015 навучальным годзе складзе 32 мільёны рублёў. А колькі плацяць студэнты — 13—14 мільёнаў? Між іншым, у школы ідзе працаваць толькі 1% ад агульнай колькасці «платнікаў». Гэта каласальная шкода для бюджэту, — падкрэсліў Анатоль Тозік. — Некаторыя краіны, якія, як і мы, сутыкнуліся з падзеннем прэстыжу прафесіі, рэзка скарацілі прыём на педагагічныя спецыяльнасці. Затое ў выніку павялічыўся конкурс. І ў грамадстве склалася меркаванне, што паступіць у педуніверсітэт дастаткова складана, а значыць, прэстыжна. У Фінляндыі конкурс у педуніверсітэт склаў у 2010 годзе 10 (!) чалавек на месца.

Мяркую, што за кошт скарачэння аб'ёмаў падрыхтоўкі можна было б накіраваць сэканомленыя грошы на падтрымку тых, хто свядома вырашыў звязаць сваю будучыню з педагогікай (напрыклад, павысіць ім стыпендыі — асабліва на вострадэфіцытных для школы спецыяльнасцях). Трэба ўвесці асаблівы парадак залічэння абітурыентаў на педагагічныя спецыяльнасці: акрамя цэнтралізаванага тэсціравання, прадугледзець для іх і тэсціраванне на прыдатнасць да педагагічнай прафесіі. Гэта дазволіла б, з аднаго боку, зрабіць набор больш якасным і не дапусціць ва ўніверсітэт і ў прафесію выпадковых людзей, а з іншага боку, стварыць арэол выключнасці вакол прафесіі педагога.

### КАР'ЕРНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Па меркаванні кіраўніка рабочай групы, неабходна падумаць над адкрытай сістэмай педагагічнай адукацыі, гэта значыць, даць магчымасць ахвотным атрымаць прафесію педагога некалькімі шляхамі. Сёння на перападрыхтоўку па педагагічных спецыяльнасцях прымаюць толькі асоб з педагагічнай адукацыяй. А ў шэрагу еўрапейскіх краін педагагічную адукацыю можна атрымаць праз розныя формы: усяго ў свеце існуюць 32 формы атрымання педагагічнай адукацыі.

— Чаму б нам не адкрываць педагагічныя магістратуры, куды б мог прыйсці па педагагічную адукацыю, напрыклад, інжынер? Ёсць меркаванне, што свядома выбраць прафесію можна толькі ў 22 —23 гады, а ў 17 гадоў гэта не заўжды атрымліваецца. Чаму інжынер не можа выкладаць у школе фізіку або тэхнічнае абслугоўванне? — пацікавіўся меркаваннем прадстаўнікоў сістэмы адукацыі Анатоль Тозік.

«А чаму педагогі неахвотна ідуць у магістратуру?» — прагучала пытанне на нарадзе. Тым больш што магістры маюць права ўжо ў першы год сваёй работы на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі. Была выказана думка, што атрымаць другую катэгорыю настаўніку-практыку прасцей, чым напісаць магістарскую дысертацыю. Да таго ж і ніякіх асаблівых даплат да заробку педагогі з магістарскай ступенню не маюць. У сувязі з гэтым узнікла прапанова дыферэнцыраваць заробкі педагогаў як у залежнасці ад узроўню іх адукацыі, так і ў залежнасці ад узроўню прафесійных дасягненняў (наяўнасці кваліфікацыйнай катэгорыі).

Анатоль Тозік лічыць, што трэба прадугледзець магчымасць атрымання маладымі спецыялістамі першай катэгорыі ўжо пасля двух гадоў работы, але гэта будзе тычыцца толькі самых таленавітых, якія добра праявілі сябе і зарэкамендавалі ў педагагічнай прафесіі.

### ВЫХАВАЙ ЗМЕНУ!

Шмат увагі на нарадзе было прысвечана пытанням прафарыентацыйнай работы. У гэтым навучальным годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт адкрыў на базе 20-й сталічнай гімназіі профільныя педагагічныя класы. Наколькі паспяховым акажацца гэты досвед, стане вядома толькі праз два гады, калі выпускнікі будуць вызначацца з выбарам жыццёвага шляху.

— Лічу, што вышэйшым навучальным установам, дзе ёсць педагагічныя спецыяльнасці, трэба спускацца з нябёсаў на зямлю і ісці ў школы. Прычым пачынаць прафарыентацыйную работу з сярэдніх класаў. Бо ў 11-х класах агітаваць за прафесію педагога позна, — падкрэслівае **рэктар БДПУ імя Максіма Танка, прафесар Аляксандр ЖУК.** — Трэба адраджаць педагагічныя класы і ствараць педагагічныя гімназіі — хоць бы па адной у кожнай вобласці. І даваць іх выпускнікам прэферэнцыі пры паступленні на педспецыяльнасці...

Сёлета амаль трэць першакурснікаў БДПУ — гэта выпускнікі ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці і каля 20% — выпускнікі сталічных устаноў адукацыі. З 240 сталічных школ на дзённую бюджэтную форму навучання паступілі ўсяго 109 чалавек.

— А давайце паспрабуем паглядзець на гэтую сітуацыю з іншага боку, — прапанаваў Аляксандр Жук. — Калі з кожнай школы (а іх у нас ужо больш як 3 тысячы) да нас прыйдзе ўсяго па адным таленавітым вучню, то ўвесь прыём будзе якасным. Няпраўда, што моладзь зусім не жадае ісці ў педагогіку. Гэта міф, які мы павінны разбурыць.

> **У пачатку 1990- гадоў у нас было 1,5 мільёна школьнікаў, а мы выпускалі штогод каля 5 тысяч маладых педагогаў. Зараз школьнікаў у нас каля 930 тысяч, а мы выпускаем 10 тысяч педагогаў. Дзе логіка?**

— Калі выпускнік вяртаецца ў родную школу спачатку ў якасці практыканта, а затым і маладога спецыяліста — гэта магутная агітацыя за прафесію настаўніка, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Анатоль Тозік. — Але калі ў педагогіку ніхто з выпускнікоў не ідзе, то ўзнікае пытанне: а што гэта за школа, што за педагагічны калектыў? Магчыма, надышоў час увесці крытэрый ацэньвання работы і дырэктара, і калектыву па наяўнасці выпускнікоў, якія не проста паступаюць у ВНУ, а выбіраюць педагагічныя спецыяльнасці. Таксама лічу, што, калі ў маладога спецыяліста заканчваецца двухгадовы тэрмін адпрацоўкі па размеркаванні і ён заключае першы кантракт, трэба яго дастаткова сур'ёзна прастымуляваць. Скажам, заключаеш кантракт на тры гады — атрымліваеш адну суму, на пяць гадоў — большую суму. Грошы ўнутры сістэмы ёсць, трэба толькі іх правільна пераразмеркаваць.

### ПЕДАГОГІ ЦІ ЎЛАДАЛЬНІКІ ДЫПЛОМАЎ?

Яшчэ адна тэма, якая выклікала гарачую дыскусію, — стварэнне на базе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта вучэбна-навуковага інавацыйнага кластара, які б аб'яднаў педагагічныя класы і педагагічныя гімназіі, сярэднія спецыяльныя педагагічныя ўстановы (у краіне дзейнічае 12 педагагічных каледжаў), установы дадатковай адукацыі і павышэння кваліфікацыі, а таксама ўніверсітэты, якія рыхтуюць педагагічныя кадры. Аднак паколькі педагагічных ВНУ ў краіне ўсяго дзве, а ўсе абласныя ўніверсітэты даўно сталі класічнымі ўніверсітэтамі, то ў многіх прадстаўнікоў ВНУ ўзніклі пытанні наконт прапанаванай мадэлі.

— Мы маглі б аб'яднаць усе згаданыя падструктуры на аснове каардынацыі і сеткавага ўзаемадзеяння, — патлумачыў рэктар БДПУ Аляксандр Жук. — Выкарыстанне кластарнай мадэлі дазволіць нам аб'яднаць інтэлектуальныя і матэрыяльныя рэсурсы, педагагічную навуку і перадавую педагагічную практыку.

**Ужо да канца гэтага года плануецца распрацаваць праект прафесійнага стандарту педагога, на падставе якога будзе перагледжаны змест педагагічнай адукацыі ў разрэзе ўсіх спецыяльнасцяў і спецыялізацый.** Тым больш, што дырэктары школ канстатуюць: з пераходам абласных педагагічных універсітэтаў у статус класічных там аслабла псіхолага-педагагічная і метадычная падрыхтоўка будучых настаўнікаў. Агульная колькасць часу на вывучэнне педагогікі, прадугледжаная тыпавым вучэбным планам спецыяльнасцяў у класічных універсітэтах, амаль утрая меншая, чым у нас на спецыяльнасцях профілю «педагогіка». Псіхалогія вывучаецца ў аб'ёме ўдвая меншым, чым у педагагічных універсітэтах. І на педагагічную практыку ў нас адводзіцца значна больш часу.

Між іншым, у Гомельскай вобласці рэгулярна праводзіцца маніторынг па пытаннях якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Што цікава, кіраўнікі школ даюць прафесійнай падрыхтоўцы выпускнікоў педагагічных каледжаў больш высокую ацэнку, чым выпускнікам ВНУ. Таму пытанні да якасці работы вышэйшай школы, на жаль, застаюцца...

### СПЕЦЫЯЛІСТЫ ШЫРОКАГА ПРОФІЛЮ

Анатоль Тозік лічыць, што трэба вяртацца да падрыхтоўкі педагогаў па інтэграваных спецыяльнасцях — гэта вырашыць шэраг праблем, напрыклад, з той жа педагагічнай нагрузкай:

— Давайце дадзім студэнту на працягу першага ці другога года вучобы магчымасць выбраць сабе яшчэ адну спецыяльнасць, прычым неабавязкова інтэграваць фізіку і матэматыку або хімію і біялогію. Чаму нельга падрыхтаваць, скажам, настаўніка гісторыі і фізічнай культуры або скамбінаваць фізіку і выяўленчае мастацтва? У нас у краіне шмат невялікіх школ, дзе патрабуюцца шматпрофільныя спецыялісты. Можна выбіраць сабе другую спецыялізацыю ў залежнасці ад патрэб рэгіёна ці пэўнай школы, калі студэнт дакладна ведае, куды ён пойдзе працаваць пасля заканчэння вучобы.

У некаторых удзельнікаў нарады ўзніклі сумненні наконт таго, што за чатыры гады можна падрыхтаваць педагога па інтэграванай спецыяльнасці. Іх прапанова заключалася ў тым, каб другую спецыяльнасць педагог атрымліваў у межах перападрыхтоўкі.

— Перападрыхтоўка — гэта калі з адной спецыяльнасці чалавек перакваліфікуецца на іншую. А нам патрэбна, каб у дыпломе выпускніка былі запісаны адразу дзве спецыяльнасці, — парыраваў Анатоль Тозік.

Разышліся меркаванні членаў рабочай групы і ў пытаннях павышэння кваліфікацыі настаўнікаў. Знайшлося даволі шмат прыхільнікаў ідэі ўкаранення так званага «адукацыйнага ваўчара». Чаму педагог не можа самастойна выбіраць, дзе яму ўдасканальваць свой прафесійны досвед?

У апанентаў гэтай ідэі быў свой аргумент: паколькі павышэнне кваліфікацыі фінансуецца з мясцовых бюджэтаў, то ніхто не захоча «выпускаць» грошы са свайго рэгіёна. Да таго ж у дырэктара ўстановы адукацыі або органаў кіравання можа быць сваё бачанне, што трэба рэгіёну, канкрэтнай школе і, адпаведна, педагогу.

### «ВЫХАВАННЕ» БАЦЬКОЎ

Натуральна, што не маглі абысці сваёй увагай члены рабочай групы і пытанне павышэння сацыяльнага статусу педагога. Найбольш дзейсным спосабам насычэння кадрамі навучальных устаноў было і застаецца павышэнне заробкаў. Урад паставіў перад сабой задачу давесці сярэдні ўзровень заробкаў у галіне адукацыі да сярэдняга заробку ў рэгіёне.

— Мы будзем прымаць меры па павышэнні заработнай платы, але толькі ў спалучэнні з мерапрыемствамі па аптымізацыі выдаткаў. Трэба шукаць рэзервы ў межах галіны, — падкрэсліў Анатоль Тозік. — У Беларусі заработная плата педагогаў разлічваецца на стаўку, якая складае зараз 20 гадзін. У Германіі нагрузка на настаўніка вагаецца ад 24 да 27 гадзін, у Англіі яна складае каля 30 гадзін. Прывяду і яшчэ адну лічбу: у Беларусі на аднаго настаўніка прыпадаюць 9 вучняў, а ў еўрапейскіх краінах — ад 14 да 16.

— Павышэнне прэстыжу працы настаўніка напрамую звязана з адказным бацькоўствам. Трэба павышаць адказнасць бацькоў за выхаванне сваіх дзяцей, а не перакладаць увесь цяжар на плечы настаўніка, — падзялілася сваім меркаваннем **намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Жанна ЖДАНОВІЧ.** — Калі ў 21.00 міліцыя затрымлівае на вуліцы падлетка, які распівае спіртныя напоі, каму тэлефануюць у першую чаргу? Не бацькам, а класнаму кіраўніку! А калі міліцыя ўстанаўлівае факт спажывання падлеткам наркотыкаў, то каго вінавацяць і просяць разабрацца? Правільна, школу. Упэўнена, што калі бацькі будуць больш часу надаваць выхаванню сваіх дзяцей, **калі настаўнікам не давядзецца хадзіць па дамах і правяраць пажарныя апавяшчальнікі і пячное ацяпленне, а таксама выконваць розныя даручэнні сельсаветаў, то ў іх будзе больш часу, каб займацца сваімі непасрэднымі прафесійнымі абавязкамі:** рыхтавацца да ўрокаў, займацца самаадукацыяй і павышаць сваю кваліфікацыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### НАФТАПРАДУКТЫ «ПАЙШЛІ» ПА ВОДНАЙ АРТЭРЫІ

**Беларускае рачное параходства правяло пробную перавозку нафтапрадуктаў з Мазыра ў Брэст. Раней іх перавозкі ўнутраным водным транспартам не вяліся.**

Заказчыкам выступіла РУП «Беларуснафта-Брэстаблнафтапрадукт». 657 тон перавозіліся на дзвюх нафтаналіўных баржах, паведамілі ў прэс-цэнтры Мінтранса. Зараз атрыманыя вынікі аналізуюцца, каб аптымізаваць схемы перавозак і павысіць іх эфектыўнасць. Разам з тым, адзначаюць спецыялісты, ужо цяпер можна гаварыць пра канкурэнтныя перавагі такога спосабу перавозак, паколькі мае месца пэўная аптымізацыя лагістычнай схемы.

У напрамку Украіны з рачнога порта Мазыр перавозка нафтапрадуктаў водным транспартам вядзецца з 2012 года. Для брэсцкіх рачнікоў гэта першы вопыт працы з падобным грузам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ГОРНЫЯ ВЫШЫНІ АЙЧЫННАГА КНІГАВЫДАННЯ

**На традыцыйнай для Дагестана і ўвогуле Паўночнага Каўказа Расіі кніжнай выстаўцы «Таркі-Тау 2014» упершыню прымуць удзел беларускія выдаўцы.**

На адным са стэндаў будзе разгорнута экспазіцыя Выдавецкага дома «Звязда». Наведвальнікі пазнаёмяцца з беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыкай, кніжнымі навінкамі. Выстаўка праходзіць з 9 па 12 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Дагестан імя Расула Гамзатава. «Звяздоўская» экспазіцыя раскажа пра «Полымя», «Нёман», «Маладосць», газету «Літаратура і мастацтва», дзе ў апошні час са сваімі творамі ў перакладзе на беларускую і рускую мову выступілі паэты і празаікі Дагестана, Чачні, Кабардзіна-Балкарыі, іншых блізкіх да Махачкалы творчых асяродкаў. Адзін з пунктаў праграмы — прэзентацыя альманаха «Сугучча», а таксама кнігі «Сугучча сэрцаў: Беларусь — Расія», дзе змешчаны пераклады твораў пісьменнікаў народаў Расіі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

### ІЛЖЫВАЯ СМС ДАВЯЛА ДА КАЛОНІІ

**Фігурант справы аб СМС-мініраванні мінскага метро атрымаў дзевяць гадоў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму.**

Нагадаем, што 34-гадовы жыхар сталічнай вобласці адправіў з мабільнага тэлефона паведамленне аб наяўнасці выбуховага ўстройства і намеры ўзарваць яго ў метрапалітэне. З-за гэтага праца падземкі была паралізаваная на некалькі гадзін, а наземны транспарт па той жа прычыне перажыў сапраўдны калапс. Нанесеная злачынствам шкода была ацэнена ў больш чым 90 мільёнаў рублёў. Падазроны быў затрыманы, факт існавання ў яго выбуховага ўстройства не пацвердзіўся. І вось заканамерны фінал той гісторыі. Хаця прыгавор можа быць абскарджаны ва ўстаноўленым законам парадку...

Дарэчы, падчас расследавання злачынства былі атрыманы даныя аб здзяйсненні абвінавачаным іншых крымінальных дзеянняў — згвалтаванне непаўналетняй, іншыя дзеянні сексуальнага характару з асобай, якая не дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту, дэманстрацыя непаўналетняму відэа парнаграфічнага зместу. Таму па справе праводзіліся шматлікія экспертызы, якія засведчылі ў абвінавачанага псіхічныя адхіленні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія і шчырыя спачуванні родным і блізкім у сувязі са смерцю ФАЛЕЙЧЫКА Аляксандра Іванавіча, начальніка Карэліцкай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

1 кастрычніка 2014 г.
№ 15 (336)


УСЁ Ў ПАРАДКУ

## АЛЕЯ БЕЗ ШКОДНЫХ ЗВЫЧАК

***У Клічаве, што на Магілёўшчыне, умовы для заняткаў спортам і здаровага ладу жыцця ствараюць нават без бюджэтных сродкаў!***

Нэлі ЗІГУЛЯ

**Вядома, без грошай зрабіць нешта па-сапраўднаму вартае цяжка. Але ж іх можна пашукаць і знайсці. Тое, што гэта магчыма, старшыня Клічаўскага райсавета дэпутатаў Уладзімір Кніга можа пацвердзіць асабістым досведам. Галоўнае, лічыць ён, мець жаданне і такіх жа захопленых справай аднадумцаў.**

Менавіта ён нядаўна арганізаваў акцыю па ачыстцы мясцовай рачулкі Ольса. Ідэю адразу ж падтрымалі актывісты БРСМ, якія дапамаглі адкрыць пазабюджэтны разліковы рахунак. Праз сродкі масавай інфармацыі дэпутат звярнуўся да арганізацый раёна і грамадскасці з заклікам дапамагчы выратаваць рэчку. Маўляў, гіне яна ад зараснікаў чароту і хмызняку, а пачысціць няма за што. За паўтара месяца на добрую справу было пералічана 23 мільёны рублёў. Грошы не самыя вялікія, але ж не адразу і Вільню пабудавалі. Сумеснымі намаганнямі ПМК-89, жылкамгаса, лясгаса, валанцёраў пачысцілі рэчышча, падсыпалі пяску, сабралі смецце. І сёння Ольсу не пазнаць. «Мы яшчэ малыя архітэктурныя формы ўсталюем, лежакі паставім, аўтастаянку зробім, — натхнёна кажа Уладзімір Кніга. — А вось тут, па суседстве з пляжам, будзе пляцоўка для пляжнага валейбола. Летам на беразе ракі да 300 чалавек адначасова збіраецца, так што трэба, каб і ўмовы былі на ўзроўні».

Зараз у рэспубліцы абмяркоўваецца праект закона Мінздрава «Аб абароне здароўя насельніцтва ад наступстваў спажывання тытуню і ўздзеяння навакольнага тытунёвага дыму». У Клічаве вырашылі зрабіць для падтрымкі гэтага праекта дзве вольныя ад курэння зоны — пляж і алею ў гарадскім парку.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*





Старшыня раённага Савета дэпутатаў Віктар Невяровіч і стараста Ніна Станевіч на пляцоўцы, дзе манціруюць станцыю абезжалезвання пітной вады.

ЯК НА ДАЛОНІ

## СВАЯ СЯРОД СВАІХ

***Даўно вядома: тыя, каго выбіраюць старастамі вёсак, працуюць не за грошы***




Леанід ЛАХМАНЕНКА

**Дзве трацiны стараст вёсак Маладзечанскага раёна — людзі пенсійнага ўзросту. І гэта станоўчы фактар, як лічыць старшыня райсавета дэпутатаў Віктар Невяровіч. На яго погляд, з абавязкамі стараcты больш паспяхова спраўляюцца людзі з вялікім жыццёвым досведам, значным працоўным стажам, працяглым удзелам у грамадскім жыцці і мясцовымі каранямі. Такім больш давяраюць, да іх больш прыслухоўваюцца, аўтарытэт гэтых стараст заснаваны на выдатным веданні «сваіх» людзей, іх традыцый, звычаяў. Ніна Аляксандраўна Станевіч цалкам адпавядае ўсім гэтым крытэрыям.**

### *Жанчына з моцным характарам*

Пра чалавека можна меркаваць і па тым, дзе і як ён жыве. Нездарма кажуць: пакажы свой дом, і я скажу, хто ты. Дом старасты вёскі Груздава ўяўляе сабой у пэўным сэнсе «адкрытую кнігу». Яе дом — гэта лепшы спосаб агітацыі за годнае і культурнае жыццё на роднай зямлі.

Гісторыя яго з'яўлення ўражвае таксама. Калі сям'я Станевіч выкупіла будынак ва ўласнасць, гэта была «каробка»: голыя сцены пад дахам і ўсё.

— У 54 гады я разам з дачкой і сынам, без мужа, які трагічна загінуў, распачала будоўлю. 6 гадоў мы крок за крокам даводзілі дом да ладу, адначасова ўзводзілі хлеў для жывёлы, лазню, гараж, добраўпарадкавалі тэрыторыю, — кажа Ніна Аляксандраўна. Дом атрымаўся прыгожым, утульным, камфортным, з гарадскімі выгодамі. У ім і прасторныя мэбляваныя пакоі, і камін, і газ, і гарачая вада, і каналізацыя. І ўсё гэта дасягнута ў асноўным высілкамі адной жанчыны з моцным характарам, якая ўмее правільна арганізаваць свой час і размеркаваць намаганні.

Дзякуючы гэтым вартасцям характару яна шмат чаго паспявае зрабіць для сябе і для іншых на грамадскай пасадзе старасты і дэпутата Палачанскага сельскага Савета, куды яе выбіраюць жыхары Груздава аж з 1961 года. Куды толькі яна ні вылучалася: член інфармацыйна-прапагандысцкай групы, грамадскай камісіі па жыллёвых пытаннях, камісіі па барацьбе з п'янствам і г. д. Як стараста і дэпутат, дабілася газіфікацыі вёскі, жыхары якой разумна выбралі Ніну Аляксандраўну старшынёй кааператыва «Груздава-газ». Па яе ініцыятыве на вясковых могілках усталявалі новую агароджу і кантэйнеры для смецця. Зроблена і шмат іншых карысных спраў для людзей.

### *«Танцаваць» ад печкі...*

Увогуле Ніна Аляксандраўна шчыры і адкрыты чалавек, «савецкі» ў лепшым сэнсе гэтага слова. У калгас яна пайшла пасля 7 класаў. Так распарадзілася маці, сказала: «Настаўніцай ты не станеш, а каб кароў даіць, гэтага хопіць».

І ўсё ж пазней яна скончыла вячэрнюю школу, потым, калі на руках былі ўжо двое малых дзяцей, завочна вучылася ў сельскагаспадарчым інстытуце. Так яна стала аграномам. Пэўны перыяд працавала намеснікам старшыні гаспадаркі. Агульны стаж работы — 57 гадоў. Цікавая дэталь — пасля выхаду на пенсію працавала яшчэ 17 гадоў. Ды і сёння стараста — энергічная і рухавая, спагадлівая да чужых клопатаў і болю.

— Калі 40–50 гадоў таму ў вёсках было шмат вяселляў і хрэсьбінаў, то цяпер тут пенсійнае «царства» з вынікаючымі адсюль праблемамі. Усё больш людзей маюць патрэбу ў падтрымцы, у вырашэнні розных спраў — простых для маладых сем'яў, але складаных для сталых людзей, — кажа стараста. І прыводзіць прыклад. У хаце 82-гадовай адзінокай жанчыны пачала моцна дыміць печка. Жанчына звярнулася да старасты па дапамогу, і Ніна Аляксандраўна знайшла ёй печніка (рэдкая ўжо на вёсцы прафесія). Дапамагае стараста з дастаўкай дроў і брыкету. Ці вось такое пытанне: «Недадалі пенсію. Што рабіць?». Або іншыя: «Ніна Аляксандраўна, чаму няма электрычнасці?» «Чаму не ідзе паштальёнка?» Вось і ў дзень нашага прыезду старэйшыне тэлефанавалі і пыталіся пра якасць вады. Яна адказвала: «У вёсцы будуецца станцыя па абезжалезванні вады, пацярпіце трохі, вада будзе больш якаснай».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



Ніна Станевіч дапамагае жыхарцы вёскі Алене Мішчанцы запоўніць дакументы.

ЖЫЦЬ У БЯСПЕЦЫ

## СПРАВЫ РЭАЛЬНЫЯ І «ПАПЯРОВЫЯ»

***Якой павінна быць пазіцыя дзяржаўных органаў і грамадскасці па прафілактыцы надзвычайных сітуацый?***

Барыс ПРАКОПЧЫК

**ПРА гэта ішла гаворка на сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў. А ў кастрычніку пытанне аб выкананні патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта Беларусі № 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны» будзе разгледжана на пасяджэннях прэзідыумаў гарадскога, раённых і сельскіх Саветаў. Усе работы па рамонце печаў, электраправодкі і ўстаноўцы аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў павінны быць завершаны да надыходу ацяпляльнага перыяду — 15 кастрычніка.**

### *Мерапрыемстваў хапае. А вынік?*

Узровень бяспекі грамадзян адлюстроўвае ў цэлым ўзровень развіцця краіны і грамадства. У канчатковым выніку гэта адзін з асноўных паказчыкаў эфектыўнасці работы ўлады на месцах. У плане рэалізацыі Дырэктывы № 1 зроблена нямала. Нядаўна гэтыя пытанні былі дэталёва разгледжаны на пасяджэнні аблвыканкама. Там прааналізавалі сітуацыю, ацанілі работу кадраў, распрацавалі план дзеянняў па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны. Чаму гэтую тэму вынеслі на сесію абласнога Савета?

— Справа ў тым, што нягледзячы на агульнае невялікае скарачэнне колькасці пажараў і загінулых людзей, сітуацыя ў шэрагу раёнаў застаецца складанай, — кажа **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.** — А напярэдадзе асенне-зімовы перыяд, калі верагоднасць узнікнення пажараў узрастае. Таму трэба выпрацаваць эфектыўныя меры па забеспячэнні бяспекі людзей — найперш пажылога ўзросту, адзінокіх, інвалідаў, сем'яў шматдзетных і тых, дзе ў сацыяльна небяспечным становішчы знаходзяцца дзеці. Аглядныя камісіі, дэпутаты ўсіх узроўняў павінны актывізаваць сваю дзейнасць у гэтым кірунку.

— Асаблівай увагі патрабуе якасць прафілактычнай работы, — адзначыў **першы намеснік начальніка Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Валерый РУДОЛЬФ.** — Быццам і складаюцца планы мерапрыемстваў, але часта яны застаюцца толькі на паперы. Напрыклад, на тэрыторыі Дзітвянскага сельсавета Лідскага раёна нядаўна загінулі адначасова два чалавекі. Яны злоўжывалі спіртнымі напоямі, аднак на пасяджэнні савета грамадскага пункта правапарадку іх паводзіны не разглядалі, гэты дом аглядная камісія не наведвала. Увогуле на тэрыторыі сельсавета была праверана толькі чвэрць ад усіх домаўладанняў. У склад агляднай камісіі, дарэчы, не былі ўключаны работнікі энерганагляду і газавай службы.

Хоць ёсць і вопыт дзейснай работы па прафілактыцы пажараў, папярэджанні гібелі і траўматызму людзей. У Берастаўіцкім раёне, напрыклад, алгарытм узаемадзеяння паміж адказнымі службамі па гэтых пытаннях адпрацоўвалі ў форме дзелавой гульні — з сітуацыйнымі задачамі і практычнымі метадамі іх вырашэння. Як вынік, колькасць пажараў значна скарацілася.

Альбо ўзяць той жа сельскі сход. Нельга абмяжоўвацца гутаркай з групай вяскоўцаў каля крамы «для галачкі», выдаючы гэта за «сход», лічыць Валерый Рудольф і прыводзіць у прыклад той жа Бераставіцкі раён — аграгарадок «Пагранічны». Напярэдадні сельскага сходу аглядная камісія абследавала ўсе домаўладанні, дзе пражываюць людзі з так званай «групы рызыкі». Усе парушэнні фіксаваліся не толькі пратакольна, але і на відэакамеру. І ўжо на сходзе па іх прымаліся канкрэтныя рашэнні — гэта рабілася сумесна прадстаўнікамі раённых службаў і грамадскасці.

Пра карысны вопыт работы расказаў і **старшыня Дзятлаўскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр БАРАНОЎСКІ.** На Дзятлаўшчыне паказчык колькасці пажараў значна ніжэйшы ў параўнанні з сярэднеабласным. Лепшыя населеныя пункты, жылыя дамы, аглядныя камісіі, згодна з рашэннем мясцовых уладаў, узнагароджваюцца прэміямі. Пры гэтым, у прыватнасці, 30% грошай накіроўваецца на заахвочванне членаў аглядных камісій, а астатняе — на фінансаванне супрацьпажарных мерапрыемстваў у населеных пунктах. Матэрыяльна стымулюецца і работа старастаў.

**За 8 месяцаў гэтага года ў вобласці адбылося 525 пажараў, загінулі 48 чалавек (за той жа перыяд летась — адпаведна 558 і 49). У дзевяці раёнах пажараў стала больш, у шасці — павялічылася колькасць ахвяр агню. Галоўныя прычыны трагедый на працягу ўжо многіх гадоў — знаходжанне людзей у нецвярозым стане, неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні. Акрамя таго, дамы гараць з-за няспраўнасці печаў і электраправодкі.**

— Практыка паказвае, што там, дзе старасты ўнікаюць у праблемы вяскоўцаў, становішча больш спакойнае і стабільнае. Калі недзе сітуацыя пагаршаецца, менавіта ад стараст ідзе адпаведная інфармацыя работнікам нашай і іншых службаў, — кажа Валерый Рудольф.

### *На дзяржаву спадзявайся, але...*

Сёння, паводле інфармацыі **намесніка начальніка ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Алега РАХУНКА,** у сацыяльна небяспечным становішчы ў вобласці знаходзяцца 2686 дзяцей з 1526 сем'яў. Абследаваны ўмовы пражывання ўсіх дзяцей. Выяўлена 57 выпадкаў няспраўнасці печаў, 28 — электраправодкі, 56 — аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў (АПА). У 91 сям'і апавяшчальнікі наогул адсутнічаюць, прычым у 28 домаўладаннях — з прычыны адмовы бацькоў ад устаноўкі гэтых прыбораў з вывадам сігналу на знешнюю святлогукавую прыладу. У народзе такіх грамадзян называюць «чырвоны нос», што ўказвае на пэўную катэгорыю людзей.

Але як жа тады быць з бяспекай дзяцей?

— Бацькі ў такіх сем'ях абавязаны выконваць мерапрыемствы індывідуальнага плана па ахове правоў непаўналетніх, у тым ліку гэта датычыцца і ўстаноўкі апавяшчальнікаў з вывадам сігналу на знешнюю святлогукавую прыладу. Адмаўляюцца ад іх усталявання? Дык яны ж не маюць права адмаўляцца. Адмова азначае прызнанне, што дзіцяці нельга жыць у гэтай сям'і. І менавіта такой пазіцыі павінны прытрымлівацца ўсе дзяржаўныя службы, — падкрэсліў Валерый Рудольф.

Толькі за 8 месяцаў гэтага года на тэрыторыі Гродзенскай вобласці дзякуючы спрацоўцы АПА выратаваны жыцці 15 чалавек, у тым ліку 5 дзяцей.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

ТЭМА ДНЯ

## «ЗВЕРХУ» ВІДАЦЬ НЕ ЎСЁ,

***таму праблемы тэрыторыі павінны вырашаць мясцовыя органы ўлады***

Надзея ЮШКЕВІЧ

**УСІМ хочацца, каб іх родны горад або вёска, вуліца, на якой стаіць дом, або сквер, дзе добра прайсціся ў вольны час, заставаліся прыгожымі і акуратнымі. Каб было прыемна вяртацца дамоў з працы, каб не было сорамна перад гасцямі за размаляваны вандаламі пад'езд або пах са смеццеправода. Але хто павінен займацца парадкам у такіх «маленькіх» маштабах? Дзяржаўныя органы? Прыватныя структуры? Мясцовыя Саветы? Менавіта пра гэта ішла гутарка на чарговым выязным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, якое праходзіла ў Салігорску і Салігорскім раёне.**

На пытанне журналістаў, чаму месцам правядзення пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні выбралі менавіта Салігорск, **Анатоль РУБІНАЎ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і старшыня Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання,** адзначыў, што ў Салігорску добра арганізаваны пытанні добраўпарадкавання, таму яго вопыт будзе цікавы прадстаўнікам іншых рэгіёнаў.

### І ў маладога можна павучыцца

Салігорск — горад малады. Ён пачаў будавацца дзякуючы распрацоўцы калійных шахтаў. Сёння прадукцыя «Беларуськалія» ідзе на экспарт у краіны на ўсіх кантынентах. А сам Салігорск працягвае расці і развівацца. Будуюцца новыя школы і дзіцячыя садкі. Вось і школа № 13, якую наведалі ўдзельнікі пасяджэння, працуе ўсяго толькі год.

**Іна СКУРАТАВА, дырэктар школы,** паведаміла, што такая навучальная ўстанова ў гэтым раёне была проста неабходна.

— Побач два вялікія мікрараёны, якія забудоўваюцца. Вельмі шмат у нас маладых і шматдзетных сем'яў. Таму, натуральна, новыя школа і дзіцячы садок тут вельмі патрэбны.

Фота БЕЛТА.



Школу адкрылі летась 21 жніўня. Сёлета ў нас 50 класаў, у якіх вучыцца 1148 школьнікаў. У мінулым годзе было 7 першых класаў, у гэтым — ужо 10.

Пакуль не пабудавалі новую навучальную ўстанову, дзеці вучыліся ў іншых школах, некаторыя з якіх з-за гэтага былі перагружаны.

— Толькі з адной салігорскай школы № 11 да нас перайшло каля 500 вучняў.

Гаворачы пра тэму пасяджэння — навядзенне парадку на зямлі і добраўпарадкаванне населеных пунктаў — Іна Скуратава акцэнтавала ўвагу на тым, што родны Салігорск заўсёды быў прыгожым горадам.

— За апошнія пяць гадоў ён і наогул змяніўся. У нас шырокія тратуары і дарогі, прыгожыя дамы, вельмі развіта інфраструктура. Гэта дастаткова камфортны горад для жыцця, працы, творчасці, самарэалізацыі. І бацькі, і дзеці тут працалюбівыя. Вось і нашы вучні заўсёды дапамагаюць добраўпарадкаваць прышкольную тэрыторыю.

### «Нічыйных» дамоў быць не павінна

У аграгарадку Зажэвічы Зажэвіцкага сельсавета для гасцей быў арганізаваны цэлы падворак з мастацкім афармленнем і элементамі вясковага побыту. На падворку былі прадстаўлены ўсе 11 сельсаветаў Салігоршчыны.

> **Мінімум 900 жыхароў раёна страцілі сваю «маленькую радзіму». А страцілі таму, што не даглядалі бацькоўскі падворак.**

**Старшыня Салігорскага раённага Савета дэпутатаў Лідзія КЛІШЭВІЧ** падчас наведання Зажэвіч расказала аб праблемах і дасягненнях свайго рэгіёна:

— На тэрыторыі Салігорскага раёна ўжо на працягу 10 гадоў праводзіцца конкурс па навядзенні парадку «Гармонія, стыль і прыгажосць».Яго пераможцы ў розных намінацыях у Дзень горада і Дзень шахцёра ўзнагароджваюцца. Сёлета было адзначана каля 30 суб'ектаў гаспадарання. Што радуе — з кожным годам колькасць заявак для ўдзелу ў конкурсе ад мясцовых жыхароў павялічваецца.

У вёсках Салігорскага раёна з 2007 года знесена прыкладна 900 пустуючых і старых дамоў.

— З аднаго боку, за гэту лічбу трэба парадавацца, з другога — пашкадаваць, — заўважае Лідзія Клішэвіч. — Бо мінімум 900 чалавек страцілі сваю «маленькую радзіму». А страцілі таму, што не даглядалі бацькоўскі падворак. Хацелася б падкрэсліць, што гэтым павінны займацца не ўлады, а самі людзі.

У той жа час старшыня Салігорскага райсавета расказала і пра станоўчую тэндэнцыю.

— Вельмі радуе, што на тэрыторыі раёна з кожным годам з'яўляецца ўсё больш ахвотных набыць дом у вёсцы. І нават не толькі ў вёсках, блізкіх да Салігорска, але і ў аддаленых населеных пунктах — і за 50 кіламетраў ад райцэнтра, і за 60. Думаю, калі мы зможам максімальна газіфікаваць вёскі, закінутых куточкаў стане менш.

### Мясцовыя Саветы прадстаўляюць народ

Адказваючы на пытанне пра дзейнасць мясцовых Саветаў, Анатоль Рубінаў заўважыў, што гэтая структура жыццёва неабходная.

— Ва ўсім свеце мясцовае самакіраванне — найважнейшы кампанент арганізацыі жыцця ў дзяржаве, яно павінна вырашаць асноўныя пытанні людзей. Іншая справа, што ў нашай дзяржаве цяпер дзейнічае камбінаваная сістэма. З аднаго боку, у нас ёсць «вертыкаль» улады, бо ўсё ж у краіне пераважае дзяржаўная ўласнасць. Урад адказны за тое, каб будаваць школы, дарогі, прадпрыемствы, стымуляваць жыццё розных рэгіёнаў. Для гэтага выкарыстоўваюцца грошы, якія акумулююцца з усёй краіны. Натуральна, што для іх размеркавання і кантролю гэтая вертыкаль патрэбна.

З іншага боку, як заўважае старшыня Савета па ўзаемадзеянні, нельга абмяжоўвацца адной вертыкаллю: не ўсё ж відаць «зверху», са сталіцы — патрэбна праца з людзьмі і ў рэгіёнах.

— Мы павінны ведаць, як людзі жывуць, якія ў іх праблемы, што ім патрэбна. Для гэтага і існуюць Саветы дэпутатаў. Яны аказваюць істотны ўплыў на працу тых жа выканкамаў, на прыняцце важных для людзей рашэнняў. Мясцовыя Саветы вельмі важныя для людзей і для дзяржавы, яны маюць вялікае значэнне на ўсіх узроўнях, у прыватнасці, на мясцовым.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

# «ЗВЕРХУ» ВІДАЦЬ НЕ ЎСЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Анатоль Рубінаў ухваліў вопыт догляду кааператыўнага дома ў Салігорску, які наведалі члены Савета па ўзаемадзеянні.

— Дом у вельмі добрым стане. Чаму? Бо тут выбудавана сістэма падтрымання парадку. Ёсць чалавек, якога выбралі і якому даплачваюць за тое, каб ён сачыў за парадкам у доме і пры неабходнасці звязваўся з адпаведнымі службамі. І робіць ён гэта, як правіла, хутка, бо і сам зацікаўлены ў тэрміновым вырашэнні пэўнай праблемы: ён жыве ў гэтым доме, а не проста збоку прыходзіць зарабляць грошы. Так і ў вёсцы: людзі, якія жывуць там, больш за ўсіх зацікаўлены ва ўладкаванні свайго жыцця. Яны павінны мець магчымасць самастойна прымаць рашэнні і арганізоўваць сваю працу.

## Больш паўнамоцтваў

Падчас пасяджэння Анатоль Рубінаў выказаў думку, што ў краіне ёсць неабходнасць у новых падыходах для павышэння эфектыўнасці органаў мясцовага самакіравання.

— Самае галоўнае ў гэтым выпадку — павышэнне ўзроўню паўнамоцтваў, ініцыятывы і зацікаўленасці на месцах. Людзям трэба даць больш магчымасцяў для гэтага, тады ў іх будзе развівацца неабходнае пачуццё гаспадара, — адзначыў Анатоль Рубінаў.

У сваю чаргу **Сямён ШАПІРА, старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта,** паведаміў, што ў Мінскай вобласці ўжо рэалізуецца эксперымент, сутнасць якога ў тым, каб павысіць адказнасць органаў мясцовага самакіравання.

— У апошнія гады органы дзяржаўнага кіравання ўзялі на сябе тыя задачы, якія павінны вырашацца на месцах. Дарэчы, дзяржорганы не заўсёды гэтыя задачы вырашалі эфектыўна. Каб выправіць сітуацыю, мы выдаткавалі 4 трыльёны беларускіх рублёў — гэта сродкі на будаўніцтва, паляпшэнне якасці дарог, падтрымку ЖКГ... Гэтыя грошы мы размеркавалі па раёнах вобласці ў залежнасці ад колькасці насельніцтва.

Такім чынам, раёны атрымалі магчымасць самастойна вырашаць, на якія мэты неабходна накіроўваць атрыманыя сродкі.

> Раней кіраўнікі раёнаў прыязджалі ў Мінаблвыканкам і прасілі грошы, а цяпер яны самастойна думаюць, як разумна размеркаваць і куды накіраваць гэтыя сродкі.

— У наступным годзе мы маем намер працягнуць гэтую практыку, — паведаміў Сямён Шапіра, — бо эксперымент паказаў: пры наяўнасці на месцах сродкаў хутчэй вырашаюцца тыя пытанні, якія раней здаваліся вельмі складанымі. Проста раней кіраўнікі раёнаў прыязджалі ў Мінаблвыканкам і прасілі грошы, а цяпер яны самастойна думаюць, як разумна размеркаваць і куды накіраваць гэтыя сродкі.

Анатоль Рубінаў станоўча ацаніў такі вопыт. Ён падкрэсліў, што гэтую ініцыятыву варта падтрымліваць і ў далейшым.

Кіраўнік Мінскай вобласці ў сваю чаргу паведаміў, што ў рэгіёне рэалізуецца яшчэ адзін цікавы эксперымент.

— Мы выдзелілі 300 мільярдаў беларускіх рублёў і змясцілі іх у фонд, з якога кіраўнікі навучальных і ўрачэбных арганізацый могуць браць сродкі на рамонт і будаўніцтва сваіх аб'ектаў. Такі эксперымент досыць паспяхова апрабаваны ў Гродзенскай вобласці, а зараз гэты механізм хоць і цяжка, але ўкараняецца і ў нас.

* * *

**Як бачым, на месцах важная не толькі наяўнасць грошай. Неабходна правільна арганізаваць дзеянні па добраўпарадкаванні. Трэба, каб людзі зразумелі, што гэта робіцца для іх. І лепш за ўсё, калі за неабходную працу будуць брацца яны самі — натуральна, за пэўную даплату. У гэтым выпадку зацікаўленасць будзе двайная — і грошы зарабіць, і добра выканаць працу, ад якой залежыць і ўласны камфорт.**

# СВАЯ СЯРОД СВАІХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Асобнае пытанне — прыватызацыя жылля, якая для старых людзей з'яўляецца не зусім зразумелым працэсам. І вось тут Ніна Аляксандраўна — вельмі каштоўная дарадчыца. Падкажа, куды звярнуцца, як правільна запоўніць паперы і г. д. Яна, дарэчы, не зусім згодна з цэнамі на аўкцыёнах па продажы свабодных участкаў зямлі. Скажам, навошта за гнілую хібару з зарослымі хмызняком «соткамі» браць з пакупніка шмат грошай? Чалавеку і так прыйдзецца моцна ўкласціся ў навядзенне парадку на закінутай сядзібе.

Ніна Аляксандраўна — вялікая прыхільніца правядзення святаў вёсак. Падчас падрыхтоўкі да іх, па яе словах, адбываецца згуртаванне людзей на выкананне карыснай агульнай справы, з'яўляецца магчымасць праявіць беларускую гасціннасць. Ну і, безумоўна, сама вёска прыгажэе. Без перабольшвання, прыкладам для іншых стала святкаванне 570-годдзя Груздава.

Жыхарам Груздава ў пэўным сэнсе пашанцавала: у іх ёсць памяшканне для правядзення сустрэч. У гэтым будынку раней была бібліятэка, потым яе скарацілі. Цяжка сказаць, які лёс напаткаў бы будынак, каб не актыўныя дзеянні старасты. Яна звярнулася ў райсавет з просьбай знайсці рашэнне, якое дазваляла б вяскоўцам выкарыстоўваць дом для сваіх сходаў.

Як аптыміст па натуры, яна бачыць абнадзейлівыя прыкметы вясковага жыцця.

— Я падлічыла — на навагоднія «ёлцы» прысутнічалі 22 дзіцяці і падлеткі. Для 98 двароў неблагая статыстыка. Прыемна бачыць маладых маці з каляскамі, — гаворыць староста.

### *Без каровы двор пусты*

Непакоіць Ніну Аляксандраўну і тое, што сёння пераважная большасць маладых сем'яў вяскоўцаў не трымаюць кароў, не здаюць малако. «Клопаты ж невялікія», — жартуе яна, — падаіла ды за плот вядро вынесла». Хоць праз хвіліну-другую ўжо на поўным сур'ёзе гаворыць аб тым, як гэта складана і адказна — даглядаць жывёлу. З сумам адзначае, што летась у вёсцы было 24 каровы, цяпер ужо 17. Сама Станевіч, нягледзячы на ўзрост, не хоча пакуль развітвацца з карміцелькай. Усё жыццё трымала не адну, а нават дзве каровы. Цяпер засталася адна. Яе будзе трымаць, пакуль здароўе дазволіць, бо без каровы двор нібы пусты.

Ніну Аляксандраўну суцяшае, што на тэрыторыі сельсавета ёсць у яе аднадумцы. Напрыклад, Зоя Міхайлаўна Сакалоўская, якая разам з мужам, ветурачом па прафесіі, трымаюць то 4, то 5 кароў! За апошнія дзесяць дзён на здачы прыкладна 800 літраў малака яны зарабілі больш за 3 мільёны рублёў. За месяц пры такіх аб'ёмах заробак можа скласці каля 10 мільёнаў. Чым не ўзор для маладых, якія хочуць сучасны дом з усімі выгодамі пабудаваць ці новую машыну набыць? Праўда, усё ж застаюцца нізкімі закупачныя цэны на малако, якое здае насельніцтва. Калі яго адвезці на продаж у Маладзечна, то можна ўдвая даражэй прадаць. Таму вяскоўцаў трэба матэрыяльна заахвочваць, каб трымалі жывёлу.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Старасце ёсць пра што пагаварыць з кожным у вёсцы. Ніна Станевіч з маладой мамай Вольгай Бажко.**

***

Нядаўна ў Груздава прыйшла прыемная навіна: па выніках конкурсу, які праходзіў па ініцыятыве Мінскага абласнога Савета дэпутатаў сярод сельскіх, пасялковых, гарадскіх Саветаў дэпутатаў, органаў грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання, староста вёскі Груздава заняла 2-е месца ў вобласці і ўзнагароджана дыпломам і грашовай прэміяй.

**Старшыня раённага Савета дэпутатаў Віктар НЕВЯРОВІЧ:**

— Са свайго боку, раённая ўлада імкнецца падтрымліваць старост маральна і матэрыяльна. Не забываем пра іх пры падвядзенні вынікаў года сярод лепшых па прафесіі ў раёне (для іх ёсць спецыяльная намінацыя). Пераможца ўзнагароджваецца граматай і прэміяй — 10 базавых велічынь. Імёны лепшых заносяцца на раённую Дошку гонару. Там, дарэчы, змешчаны фотапартрэт лепшай старасты раёна 2013 года — Ніны Аляксандраўны Станевіч.

Сумесным рашэннем прэзідыума райсавета і райвыканкама прыняты захады па ўдасканаленні матэрыяльнага стымулявання працы старост вёсак. Дакументам прадугледжваюцца выплаты за кожны квартал. Іх памер залежыць ад колькасці насельніцтва ў вёсцы. Калі ў ёй налічваецца да 50 двароў, то выплата складае 0,5 базавай велічыні. Да 100 двароў — 1 базавая велічыня. Звыш 150 двароў — 1,5 базавай велічыні. Невялікія грошы, але ж і яны не лішнія.

*Маладзечанскі раён.*

# СПРАВЫ РЭАЛЬНЫЯ І «ПАПЯРОВЫЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Акрамя таго, больш актыўна павінна ўкараняцца новая форма сацыяльнага абслугоўвання — дамы самастойнага сумеснага пражывання. Роданачальнікам тут стаў у 2011 годзе Смаргонскі раён, потым гэтая ідэя была падтрымана ў Дзятлаўскім, Лідскім, Іўеўскім, Воранаўскім, Слонімскім раёнах. Сёлета такія дамы (дзе забяспечваюцца зручныя і бяспечныя ўмовы пражывання пажылых людзей пры значна меншых фінансавых затратах у параўнанні з іншымі сацыяльнымі ўстановамі) павінны быць уведзены ў эксплуатацыю і ў шэрагу іншых раёнаў.

Дарэчы, на прыкладзе Гродзеншчыны пытанне аб заканадаўчым статусе дамоў самастойнага сумеснага пражывання цяпер разглядаецца на ўзроўні рэспублікі.

### *Каментарый у тэму*

**Віктар МАРОЗАЎ, пракурор Гродзенскай вобласці:**

*— Пакуль персанальна не пачнём указваць на дрэнную работу тым ці іншым службовым асобам, будзем мець «увогуле». А так нельга. Трэба, каб кожны адказваў за выкананне сваіх абавязкаў, у тым ліку і дэпутаты. Як так: у населеным пункце загінулі людзі на пажары, а дэпутат па гэтай акрузе ні разу ў тую вёску не выехаў, не прайшоўся па дамах, дзе жывуць старыя, і не пацікавіўся праблемамі сваіх выбаршчыкаў?.. Ці працуюць там пажарныя апавяшчальнікі? А можа, печку трэба адрамантаваць?*

**Анатоль ЗІМНАВОДА, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама:**

*— Мы вывучылі сітуацыю з апавяшчальнікамі і бачым, што значная іх частка штогод устанаўліваецца… адным і тым жа людзям. Або апавяшчальнік знялі і выкінулі, або ён зламаўся — ідзе паўторная ўстаноўка. За перыяд дзеяння гэтай праграмы паўторна ўсталявана каля 1300 АПА — гэта больш за 80 мільёнаў рублёў бюджэтных сродкаў. На жаль, даступнасць сацыяльнай дапамогі адсунула абавязак грамадзян клапаціцца пра ўласныя домаўладанні на другі план — гэта перакладзена на дзяржаўныя органы. Таму ўсе суб'екты прафілактыкі павінны больш жорстка прымяняць меры, у тым ліку адміністрацыйнага ўздзеяння, да людзей, якія ігнаруюць нормы бяспекі. Выканкамам трэба вызначыць дакладны парадак і крыніцы фінансавання ўстаноўкі апавяшчальнікаў. За кошт уласных сродкаў грамадзян — для пажылых людзей, якія маюць працаздольных дзяцей. А для адзінокіх, на мой погляд, — з улікам памеру пенсіі.*

**ЁСЦЬ ПЫТАННЕ**

# КАЛІ СЦЕНЫ ЎЖО НЕ ДАПАМАГАЮЦЬ

### *Як тэрмінова пазбаўляцца ад пустуючых і старых хат у сельскай мясцовасці?*

**Аляксандр Матарас, начальнік абласной землеўпарадкавальнай службы, лічыць, што навядзенне парадку на зямлі — гэта стварэнне бяспечных умоў пражывання, якасць жыцця людзей і, вядома ж, пазітыўныя змены ў эканоміцы.**

ТОЛЬКІ за чатыры з паловай гады на Гомельшчыне было знесена каля 20 тысяч старых хат. Нягледзячы на станоўчую дынаміку і пэўныя поспехі на фоне іншых рэгіёнаў рэспублікі, ёсць шмат момантаў, якія выклікаюць заклапочанасць. Бо 12 тысяч пустуючых дамоў яшчэ чакаюць вырашэння свайго далейшага лёсу.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Між тым афіцыйная статыстыка часам значна разыходзіцца з рэальнай сітуацыяй. Выезды спецыялістаў землеўпарадкавальнай службы на месцы паказваюць, што фактычна безгаспадарчых дамоў значна больш. Напрыклад, па звестках Рудня-Марымонаўскага сельсавета Гомельскага раёна, на яго тэрыторыі няма ніводнай пустуючай і трухлявай хаты, аднак рэальна толькі ў трох вёсках іх выяўлена 12. Аналагічная сітуацыя паўсюдна.

Справа ў тым, што многія з такіх дамоў маюць гаспадара, які вельмі доўга думае, што рабіць са спадчыннай маёмасцю. Яна ж тым часам прыходзіць у запусценне. Як той казаў, і сам не гам, і другому не дам. Сельсаветы павінны працаваць з уласнікамі і схіляць іх або да прывядзення будынка і тэрыторыі ў належны стан, або да перадачы яго ў камунальную ўласнасць. Там, дзе старшыні сельвыканкамаў упарта нагадваюць уласнікам домаўладанняў аб іх абавязках, работа ідзе: з пачатку года на Гомельшчыне прыведзена ў парадак без зносу 1127 дамоў (лепшыя ў гэтым кірунку — Лельчыцкі, Нараўлянскі і Жыткавіцкі раёны).

АЛЕ нярэдкія выпадкі, калі кіраўнікі сельскай улады канстатуюць факт наяўнасці ўласнікаў, але сістэмнай працы з імі не праводзяць, займаюць пазіцыю чакання, адзначае Аляксандр Матарас.

— У выніку ў Брагінскім, Буда-Кашалёўскім і Рагачоўскім раёнах прыкладаў станоўчага ўплыву на ўласнікаў не знайшлося наогул. Асобныя райвыканкамы, парушаючы Указ № 100, перасталі ўключаць пустуючыя будынкі ў адпаведны рэгістр, што выключае права выканкама на зварот у суд.

Паколькі на месцах адсутнічае ініцыятыва па належным выкананні патрабаванняў, з боку кіраўніцтва вобласці сёлета да ўсіх раёнаў было даведзена заданне па зносе 5723 дамоў. Але яно можа быць не выканана, бо па выніках васьмі месяцаў знесена толькі 58%. Дарэчы, у сельсаветах кажуць, што праблема не ў выдаткаванні адпаведных фінансаў, а ў падрыхтоўцы патрэбных дакументаў. Праўда, што да грошай, якія выдзяляюцца непасрэдна на правядзенне зносу, — тут высветлілася дзіўная рэч. Аказваецца, у Мазырскім раёне такія работы па зносе можна выканаць за 3,5 млн рублёў, а ў Добрушскім — аж за 11,6. (Апошняя лічба выклікала сапраўднае абурэнне старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра Дворніка, які папрасіў тэрмінова разабрацца з існуючай сітуацыяй.)

Як выкарыстоўваць пустуючыя хаты, перададзеныя ў камунальную ўласнасць згодна з Указам № 100? Сельсавет можа прадаваць іх па спрошчанай працэдуры — без папярэдняй рэгістрацыі ў якасці аб'ектаў нерухомай маёмасці. Такім чынам, падказваюць спецыялісты землеўпарадкавальнай службы, можна было б хутка знайсці новых гаспадароў, асабліва для будынкаў у вёсках уздоўж Прыпяці. Ахвотнікаў мець дачу ў такім прывабным месцы знойдзецца дастаткова. Між іншым, вопыт у гэтым кірунку ёсць. У спісе сельвыканкамаў, якія прадаюць пустуючыя хаты, — Баршчоўскі і Азяршчанскі Рэчыцкага раёна.

НЕ менш важнае і выкарыстанне земляў, якія вызваліліся пасля зносу, перадача іх у сельгасабарот. Спецыялісты абласной службы землеўпарадкавання падлічылі, што прыбыткі ад выкарыстання палеткаў пад сельгаскультуры можна атрымаць ужо ў першы год пасля зносу. І ўсё ж у большасці раёнаў сельскагаспадарчыя арганізацыі займаюць землі населеных пунктаў неахвотна, таму тут вельмі важная пазіцыя кіраўніцтва раёнаў, — падкрэслівае Аляксандр Матарас:

— Дзе гэта пазіцыя ёсць — там ёсць і вынік. Так адбываецца ў Рагачоўскім, Нараўлянскім, Мазырскім раёнах, дзе ўсе землі актыўна ўцягваюцца ў абарот. Там, дзе зямлю немагчыма ўцягнуць у сельскагаспадарчы абарот ці перадаць грамадзянам, відавочны варыянт — лесагаспадарчая вытворчасць. Калі ж ёсць неабходнасць пакідаць участкі ў землях агульнага карыстання, то неабходна ствараць на іх дзіцячыя пляцоўкі, паркі, малыя архітэктурныя формы і гэтак далей, прадухіляючы зарастанне і ператварэнне ў месцы для звалак смецця.

Уся адказнасць за работу з трухлявымі і пустуючымі хатамі ляжыць на старшынях сельвыканкамаў, якія павінны быць паўнамоцнымі гаспадарамі на сваёй тэрыторыі (гэта падкрэслівалася і падчас апошняга пасяджэння аблвыканкама). Павінна быць распрацавана сістэма, заснаваная на ўзаемадзеянні мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў усіх узроўняў і іх структурных падраздзяленняў, а таксама адпаведных суб'ектаў гаспадарання.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# АЛЕЯ БЕЗ ШКОДНЫХ ЗВЫЧАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Прапанову з алеяй ад раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі народныя абраннікі падтрымалі, як той казаў, абедзвюма рукамі. А іх, у сваю чаргу, кіраўнікі мясцовых арганізацый і прадпрымальнікі. Справа добрая і запатрабаваная.

— Пра тое, што лавак у парку не хапае, мне прыходзілася чуць у тым ліку і ад свайго сына, — кажа Уладзімір Валянцінавіч. — Гэта любімае месца адпачынку моладзі, а вось прытуліцца ім няма дзе.

Галоўны дзяржаўны санурач раёна Віктар Шапялевіч разам з Уладзімірам Кнігай увесь інтэрнэт «перарылі,» каб знайсці найбольш арыгінальныя лаўкі. Жылкамгасу, напрыклад, даручылі зрабіць такую, дзе замест ножак — сялянскія лапці. Яна, дарэчы, ужо ўсталявана ў парку. Але хутка з'явяцца і астатнія шэсць. Прычым ад розных вытворцаў, двое з якіх прадстаўляюць у Клічаве прыватны бізнес.

Тое, што справа робіцца не дзеля галачкі, упэўнілася асабіста. На маіх спадарожнікаў, якія горача абмяркоўвалі дэталі праекта на пакуль што пустой алеі, увагу звярталі нават прахожыя. Яны чулі словы «лаўкі», «фантан», «русалка», «ліхтары» і, напэўна, не верылі сваім вушам. Ці магчыма такое ў маленькім райцэнтры? Аказваецца, магчыма. І фантан, і русалка таксама фігуруюць у праекце. Фантан — справа камунальнікаў, а вось русалку бярэцца зрабіць вядомы ў раёне майстар Пётр Заікін. Ён зараз займаецца мастацкім афармленнем гэтага прыгожага куточка. Дарэчы, яго драўлянымі скульптурамі «заселены» ўвесь Клічаў. І гэта не проста нейкая там безгустоўшчына — кожны прадмет мае свой сэнс і прызначэнне. Для алеі без шкодных звычак ён прыдумаў «візітоўку» ў выглядзе выратавальнага круга і змешчанага пасярод яго сэрца — яно ж найбольш пакутуе ад нашага бязволля. Знак размесціцца на металічнай арматуры, над якой ужо працуе яшчэ адна клічаўская арганізацыя.



**Пётр Заікін: «Візітоўка для будучай алеі напалову гатовая».**



**Планёрка з выездам на месца. Віктар Шапялевіч, Уладзімір Кніга і Пётр Заікін на будучай алеі.**

> Сумеснымі намаганнямі ПМК-89, жылкамгаса, лясгаса, валанцёраў пачысцілі рэчышча, падсыпалі пяску, сабралі смецце. І сёння Ольсу не пазнаць.

У парку таксама з'явіцца шэраг знакаў, якія (на рускай і англійскай мовах) будуць нагадваць — курэнне забаронена! А каб ніхто гэты заклік не ігнараваў, па алеі будзе перыядычна прагульвацца міліцэйскі патруль.

Віктар Шапялевіч, заклапочаны ахоўвай здароўя сваіх землякоў, вельмі ўдзячны старшыні райсавета: «Ён сам не мае шкодных звычак і заўсёды падтрымлівае нашы праекты». Успамінае, як некалькі гадоў таму няўрымслівы дэпутат, які займаў зусім іншую пасаду, захапіўся ідэяй зрабіць на месцы закінутага кар'ера лыжную трасу. Увасобіць у жыццё яе дапамаглі ўсё тыя ж лясгас, ПМК-89, ДРБУ-126, раённыя электрасеткі. У справу таксама не было ўкладзена ніводнага бюджэтнага рубля. І гэта нягледзячы на тое, што для 250-метровага насыпу было прывезена амаль 200 «МАЗаў» грунту і асветлена 1600 метраў трасы! «Даходзіла да камічнага, — усміхаецца Уладзімір Кніга.— Слупы старыя знайшлі, а вось з лямпачкамі ніяк не маглі вырашыць пытанне. Дзякуй добрым людзям — дапамаглі». Калі траса запрацавала, ад жадаючых пакатацца адбою не было. Як былы выратавальнік, падпалкоўнік унутранай службы МНС, Уладзімір Кніга са спортам на «ты». Сам любіць займацца канькавым бегам на лыжах і іншых заахвоціў. Нават зрабіў з падручнага матэрыялу каток, якім прасавалі перад спаборніцтвамі снег. Гледзячы на яго, на лыжы ўсталі і іншыя кіраўнікі раёна, якія раней пра гэта нават і не думалі.

Зараз у Клічаве збіраюцца рэалізаваць яшчэ адзін экалагічны праект — упрыгожыць хвойнымі дрэвамі вуліцу Ленінскую. Уладзімір Кніга падлічыў, што спатрэбіцца 100 туй і 90 дрэў ядлоўцу. У лясгасе саджанцы да 50 сантыметраў каштуюць 37 тысяч і 19 тысяч рублёў адпаведна. Хіба ж гэта грошы? Такую суму можа ахвяраваць любы неабыякавы да свайго горада жыхар, а для арганізацыі — гэта і наогул «капейкі».

— Асабіста я вырашаў, што пасаджу 15 шарападобных вербаў, — кажа народны абраннік. — Яны таксама танныя — усяго 19 тысяч рублёў за дрэва. Хочацца, каб у горадзе было прыгожа і камфортна. І тое, што наш пачын згадзіліся падтрымаць іншыя, вельмі радуе. Хацелася б зрабіць у Клічаве зялёны куточак у стылі Рэнесанса. Ідэю я падглядзеў у інтэрнэце, а ў лясгасе паабяцалі дапамагчы яе ажыццявіць.

Яшчэ адна запаветная мара Уладзіміра Кнігі — зрабіць у Клічаве сучасную пляцоўку па міні-футболе. «Такую ж, як у Быхаве. Яна з'явілася дзякуючы сацыяльнаму праекту «Родная старонка — дзецям», — кажа ён. — Ініцыятары праекта — праваўладальнік гэтага гандлёвага знака і Беларуская федэрацыя футбола — на працягу 5 гадоў плануюць зрабіць на тэрыторыі Беларусі 118 шматфункцыянальных дваровых спартыўных пляцовак круглагадовага выкарыстання. У нашым райцэнтры, на жаль, няма ні нармальнай спартзалы, ні басейна, ні лядовай арэны, як у іншых гарадах. Спадзяюся, што ў Мінспорту, куды я накіраваў зварот, паставяцца да нас з паразуменнем.

Не выключна, што з часам вакол гарадскога парку ў Клічаве з'явіцца яшчэ і лыжаролерная траса. Цяжка нават уявіць, колькі грошай гэта можа каштаваць. Але мне здаецца, што ў старшыні райсавета, які таксама загарэўся гэтай ідэяй, атрымаецца іх знайсці.

**Фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.209. Нумар падпісаны ў 19.30 30 верасня 2014 года.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

**Гомельский областной исполнительный комитет (организатор конкурса) извещает о проведении конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта**

## «14-12-эт. жилой дом по ул. Мазурова в микрорайоне №18 г. Гомеля»

**(далее – конкурс)**

**Предмет конкурса:** право выступать заказчиком (застройщиком) по строительству объекта «14-12-эт. жилой дом по ул. Мазурова в микрорайоне №18 г. Гомеля»

**Наименование объекта строительства:** «14-12-эт. жилой дом по ул. Мазурова в микрорайоне №18 г. Гомеля»
14-12-этажный жилой дом – отдельностоящее здание, входит в группу жилых зданий переменной этажности, формирующих архитектурный облик ул. Головацкого–Мазурова и в целом микрорайона № 18. Проект жилого дома подразумевает индивидуальный проект, согласно эскизному проекту, разработанному в составе «Проекта застройки микрорайона №18», по согласованию с разработчиком проекта застройки данного микрорайона ОАО «Институт «Гомельпроект».
Площадь для обслуживания жилого дома и благоустройства дворовой и прилегающей территории ориентировочно 0,55 га (уточнить проектом). Предусмотреть остекление лоджий. Предусмотреть открытую надземную 2-уровневую парковку согласно проекту застройки микрорайона. Земельный участок сервитутом не обременен и не имеет ограничения прав в связи с расположением в охранных зонах инженерных сетей и сооружений.

**Место проведения конкурса:** 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр. Ленина 2, Гомельский областной исполнительный комитет, тел. 8 (0232) 746371.

**Порядок проведения конкурса:** определен Положением о порядке организации и проведения конкурсов по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирных жилых домов, за исключением жилых домов повышенной комфортности, в г. Минске и областных центрах (далее – Положение), утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 10 сентября 2013 г. № 798 (Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь, 19.09.2013, 5/37805).
**Конкурс проходит в два этапа.**
**Первый этап – предварительный квалификационный отбор.**
**Второй этап – конкурс по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта.**

**Дата, время и место приема заявления на участие в конкурсе и прилагаемых к нему документов: Срок подачи заявлений на участие в предварительном квалификационном отборе:** рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – до **25 ноября 2014 г. до 16.00. Заявление и документы для предварительного классификационного отбора представляются** секретарю конкурсной комиссии по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр-т Ленина, 2, каб. 405, тел. (80232) 74-63-71 в запечатанном конверте с надписью «Предварительный квалификационный отбор для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству «14-12-эт. жилой дом по ул. Мазурова в микрорайоне №18 г. Гомеля» «Не вскрывать!». На конверте указывается наименование претендента.
«Образец заявления» размещен на сайте www.gomel-region.gov.by раздел «Строительство и архитектура». Претендент предоставляет следующие документы на русском языке, подтверждающие экономическое и финансовое положение претендента:
**1.** копия (без нотариального засвидетельствования) устава имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации;
**2.** бухгалтерская отчетность за последние отчетный год и период;
**3.** справка о коэффициентах платежеспособности претендента (коэффициент текущей ликвидности, коэффициент обеспеченности собственными оборотными средствами, коэффициент обеспеченности финансовых обязательств активами и другое), рассчитанных в установленном законодательством порядке;
**4.** расчеты прибыли за последние три года;
**5.** расчет стоимости чистых активов претендента на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
**6.** сведения о дебиторской и кредиторской задолженностях, в том числе просроченных свыше трех месяцев, на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
**7.** справка о задолженности по платежам в бюджет на 1 число месяца подачи заявления на участие в конкурсе;
**8.** справка об аудиторской проверке деятельности организации-претендента;
**9.** справка о платежеспособности из банка, в котором обслуживается претендент;
**10.** документы, содержащие сведения о возведении многоквартирных жилых домов за последние три года и сроках ввода их в эксплуатацию, заказчиком (застройщиком) по которым является претендент.
**Кроме этого претендентом представляются подтвержденные документально сведения:**
- о деловой репутации претендента (не менее 3-х отзывов);
- о наличии опыта работ по строительству многоквартирных жилых домов за последние три года;
- о выполнении аналогичных проектов, сопоставимых по виду и объему с объектом строительства (реализованных, нереализованных);
- об участии претендента в качестве ответчика в судебных или арбитражных процессах с указанием предмета иска за последние три года;
- о наличии наложенного ареста на имущество претендента.
Предоставление задатка на участие в конкурсе на этапе предварительного квалификационного отбора не требуется.
Предложения, представленные позже указанного срока, к рассмотрению не принимаются. Конкурсная комиссия имеет право продлить срок подачи заявлений.

| Дата, время и место проведения предварительного квалификационного отбора | 28 ноября 2014 г. 10.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2. (1 этаж, зал заседаний) |
|---|---|

**К участию в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта допускаются претенденты, прошедшие предварительный квалификационный отбор, внесшие в установленном порядке задаток, своевременно подавшие конкурсное предложение и прилагаемые к нему документы.**

**Подробности о предмете конкурса, состав конкурсного предложения, перечень прилагаемых к нему документов отражены в конкурсной документации**. Конкурсная документация предоставляется секретарем комиссии претендентам, прошедшим предварительный квалификационный отбор, не позднее трех рабочих дней после перечисления задатка и подачи заявления на участие в конкурсе по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель проспект Ленина, 2, каб. 405, тел. 746371.
Задаток **в сумме 50000000 бел. руб. перечисляется на р/с 3015056440074 в филиале 300 ГОУ АСБ Беларусбанк, получатель ГУ «Гомельоблстройкомплекс», адрес банка 246050, г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, получатель: государственное учреждение «Гомельское областное управление строительным комплексом», адрес: 246050, г. Гомель, ул. Советская, 28. УНП 490321784, т./ф.: 740394, 748831.** Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в конкурсе(2 этап).

**Дата, время и место приема конкурсного предложения и прилагаемых к нему документов** в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – **11 декабря 2014 г. до 13.00. Заявление и конкурсные предложения представляются** секретарю конкурсной комиссии по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр-т Ленина, 2, каб. 405, тел. (80232) 74-63-71 в запечатанном конверте с надписью «Конкурсное предложение для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству «14-12-эт. жилой дом по ул. Мазурова в микрорайоне №18 г. Гомеля» «Не вскрывать!». На конверте указывается наименование претендента.
Претендент имеет право отозвать свое конкурсное предложение в любое время, но не позднее 5(пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по выбору победителя конкурса.

**Срок, в течение которого организатор конкурса может реализовать свое право на отказ от проведения конкурса:** в любое время, но не позднее 5 (пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по определению результатов предварительного квалификационного отбора претендентов.

**Дата, время и место заседания конкурсной комиссии по вскрытию конвертов с конкурсными предложениями с участием представителей претендентов: 12 декабря 2014 г. 10.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2. (1 этаж, зал заседаний).**

**Дата, время и место выбора победителя конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта: 22 декабря 2014 г. 10.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 3. (1 этаж, зал заседаний).**
**Претенденту, не победившему в конкурсе, возвращается задаток** в течение 5 (пяти) рабочих дней после подведения итогов по выбору победителя.

**Срок подписания договора на реализацию права строительства объекта, заключаемого по результатам конкурса:** не позднее 30 декабря 2014 г. Существенные условия последующей сделки оговариваются в планируемом к заключению договоре на реализацию права строительства объекта.

**Возмещение затрат на организацию и проведение конкурса** (расходы по публикации извещений в средствах массовой информации, затрат на подготовку конкурсной документации и ее тиражирование, почтовые, канцелярские и другие расходы, предусмотренные законодательством) **осуществляется победителем конкурса** в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подведения результатов конкурса и до подписания договора на реализацию права на строительство объекта. Организатору конкурса представляются заверенные надлежащим образом копии платежных документов, подтверждающих возмещение расходов на организацию и проведение конкурса.

**Информация о проведении конкурса, в том числе перечень документов для предварительного квалификационного отбора, а также формы документов**, предоставляемых претендентами конкурса, размещена на официальном интернет-портале Гомельского облисполкома http://gomel-region.gov.by.



**Дополнение к проектной декларации ООО «Триумфстрой»,**
*опубликованной в газете «Звязда» №173 (27783) от 12.09.2014*
**по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями бытового обслуживания и гараж-стоянкой по ул. П. Глебки» (без инженерных сетей)**

ООО «Триумфстрой» информирует о внесении дополнений в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» № 173 (27783) от 12.09.2014 по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями бытового обслуживания и гараж-стоянкой по ул. П. Глебки» (без инженерных сетей):

Количество помещений бытового обслуживания, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, – 5 шт.

Ознакомление дольщиков с объектами долевого строительства и условиями заключения договора производится по адресу: г. Минск, ул. Е. Полоцкой, д. 1, оф. 117 а, тел.: 8 029 222 20 16, 8 029 222 20 41.

УНП 190465926



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

**Гомельский областной исполнительный комитет (организатор конкурса) извещает о проведении конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта**

## «Три 24-этажных жилых дома со встроенными помещениями по улице Мазурова микрорайоне № 18 г. Гомеля»

**(далее – конкурс)**

**Предмет конкурса:** право выступать заказчиком (застройщиком) по строительству объекта «Три 24-этажных жилых дома со встроенными помещениями по улице Мазурова микрорайоне №18 г. Гомеля»

**Наименование объекта строительства:** «Три 24-этажных жилых дома со встроенными помещениями по улице Мазурова микрорайоне №18 г. Гомеля»
24-этажные жилые дома со встроенно-пристроенными помещениями образуют группу жилых и общественных зданий, формирующих архитектурный облик ул. Мазурова и в целом облик микрорайона №18. Строительство жилых домов ведется по индивидуальному проекту, предусмотренного в составе «Проекта застройки микрорайона №18» по согласованию с разработчиком проекта застройки данного микрорайона ОАО «Институт «Гомельпроект». Позиции №№15, 16, 17 согласно проекта застройки являются однотипными зданиями, в связи с этим возможна разработка аналога с последующей привязкой для вышеперечисленных позиций с изменениями в части встроенно-пристроенных помещений.
На данном земельном участке имеется необходимая инженерная инфраструктура: совокупность инженерных коммуникаций (магистральные сети, объекты и сооружения) необходимых для решения локального обеспечения предлагаемых объектов.

**Место проведения конкурса:** 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр. Ленина 2, Гомельский областной исполнительный комитет, тел. 8 (0232) 746371.

**Порядок проведения конкурса:** определен Положением о порядке организации и проведения конкурсов по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирных жилых домов, за исключением жилых домов повышенной комфортности, в г. Минске и областных центрах (далее – Положение), утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 10 сентября 2013 г. № 798 (Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь, 19.09.2013, 5/37805).
**Конкурс проходит в два этапа.**
**Первый этап – предварительный квалификационный отбор.**
**Второй этап – конкурс по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта.**

**Дата, время и место приема заявлений на участие в конкурсе и прилагаемых к ним документов: срок подачи заявлений на участие в предварительном квалификационном отборе:** рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – до **25 ноября 2014 г. до 16.00. Заявление и документы для предварительного классификационного отбора представляются** секретарю конкурсной комиссии по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр-т Ленина, 2, каб. 405, тел. (80232) 74-63-71 в запечатанном конверте с надписью «Предварительный квалификационный отбор для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству «Три 24-этажных жилых дома со встроенными помещениями по улице Мазурова микрорайоне №18 г. Гомеля» «Не вскрывать!». На конверте указывается наименование претендента.
«Образец заявления» размещен на сайте www.gomel-region.gov.by раздел «Строительство и архитектура». Претендент предоставляет следующие документы на русском языке, подтверждающие экономическое и финансовое положение претендента:
**1.** копия (без нотариального засвидетельствования) устава, имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации;
**2.** бухгалтерская отчетность за последние отчетный год и период;
**3.** справка о коэффициентах платежеспособности претендента (коэффициент текущей ликвидности, коэффициент обеспеченности собственными оборотными средствами, коэффициент обеспеченности финансовых обязательств активами и другое), рассчитанных в установленном законодательством порядке;
**4.** расчеты прибыли за последние три года;
**5.** расчет стоимости чистых активов претендента на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
**6.** сведения о дебиторской и кредиторской задолженностях, в том числе просроченных свыше трех месяцев, на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
**7.** справка о задолженности по платежам в бюджет на 1 число месяца подачи заявления на участие в конкурсе;
**8.** справка об аудиторской проверке деятельности организации-претендента;
**9.** справка о платежеспособности из банка, в котором обслуживается претендент;
**10.** документы, содержащие сведения о возведении многоквартирных жилых домов за последние три года и сроках ввода их в эксплуатацию, заказчиком (застройщиком) по которым является претендент.
**Кроме этого претендентом представляются подтвержденные документально сведения:**
- о деловой репутации претендента (не менее 3-х отзывов);
- о наличии опыта работ по строительству многоквартирных жилых домов за последние три года;
- о выполнении аналогичных проектов, сопоставимых по виду и объему с объектом строительства (реализованных, нереализованных);
- об участии претендента в качестве ответчика в судебных или арбитражных процессах с указанием предмета иска за последние три года;
- о наличии наложенного ареста на имущество претендента.
Предоставление задатка на участие в конкурсе на этапе предварительного квалификационного отбора не требуется.
*Предложения, представленные позже указанного срока, к рассмотрению не принимаются. Конкурсная комиссия имеет право продлить срок подачи заявлений.*

| Дата, время и место проведения предварительного квалификационного отбора | 28 ноября 2014 г. 10.30. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2. (1 этаж, зал заседаний) |
|---|---|

**К участию в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта допускаются претенденты, прошедшие предварительный квалификационный отбор, внесшие в установленном порядке задаток, своевременно подавшие конкурсное предложение и прилагаемые к нему документы.**

**Подробности о предмете конкурса, состав конкурсного предложения, перечень прилагаемых к нему документов отражены в конкурсной документации**. Конкурсная документация предоставляется секретарем комиссии претендентам, прошедшим предварительный квалификационный отбор, не позднее трех рабочих дней после перечисления задатка и подачи заявления на участие в конкурсе по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, проспект Ленина, 2 каб. 405, тел. 746371.
Задаток **в сумме 50000000 бел. руб. перечисляется на р/с 3015056440074 в филиале 300 ГОУ АСБ Беларусбанк, получатель ГУ «Гомельоблстройкомплекс», адрес банка 246050, г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, получатель: государственное учреждение «Гомельское областное управление строительным комплексом», адрес: 246050, г. Гомель, ул. Советская, 28. УНП 490321784, т./ф.: 740394, 748831.** Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в конкурсе (2 этап).

**Дата, время и место приема конкурсного предложения и прилагаемых к нему документов** в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – **11 декабря 2014 г. до 13.00. Заявление и конкурсные предложения представляются** секретарю конкурсной комиссии по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр-т Ленина, 2, каб. 405, тел. (80232) 74-63-71 в запечатанном конверте с надписью «Конкурсное предложение для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству «Три 24-этажных жилых дома со встроенными помещениями по улице Мазурова в микрорайоне №18 г. Гомеля» «Не вскрывать!». На конверте указывается наименование претендента.
Претендент имеет право отозвать свое конкурсное предложение в любое время, но не позднее 5(пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по выбору победителя конкурса.

**Срок, в течение которого организатор конкурса может реализовать свое право на отказ от проведения конкурса:** в любое время, но не позднее 5 (пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по определению результатов предварительного квалификационного отбора претендентов.

**Дата, время и место заседания конкурсной комиссии по вскрытию конвертов с конкурсными предложениями с участием представителей претендентов: 12 декабря 2014 г. 11.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2. (1 этаж, зал заседаний).**

**Дата, время и место выбора победителя конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта: 22 декабря 2014 г. 11.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2. (1 этаж, зал заседаний).**
**Претенденту, не победившему в конкурсе, возвращается задаток** в течение 5 (пяти) рабочих дней после подведения итогов по выбору победителя.

**Срок подписания договора на реализацию права строительства объекта, заключаемого по результатам конкурса:** не позднее 30 декабря 2014 г. Существенные условия последующей сделки оговариваются в планируемом к заключению договоре на реализацию права строительства объекта.

**Возмещение затрат на организацию и проведение конкурса** (расходы по публикации извещений в средствах массовой информации, затрат на подготовку конкурсной документации и ее тиражирование, почтовые, канцелярские и другие расходы, предусмотренные законодательством) **осуществляется победителем конкурса** в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подведения результатов конкурса и до подписания договора на реализацию права на строительство объекта. Организатору конкурса представляются заверенные надлежащим образом копии платежных документов, подтверждающих возмещение расходов на организацию и проведение конкурса.

**Информация о проведении конкурса, в том числе перечень документов для предварительного квалификационного отбора, а также формы документов**, предоставляемых претендентами конкурса, размещена на официальном интернет-портале Гомельского облисполкома http://gomel-region.gov.by.



Утерянный бланк страхового полиса формы 2 РН, 2РП серии НС № 0365217, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» **считать недействительным.**

УНП 101063229


■ Дзяржава і бізнес

# НЕ ЗАКОПВАЙЦЕ ТАЛЕНТ У ЗЯМЛЮ

## Калі на справе кіраўнік недзяржаўнага прадпрыемства паказаў добры прыклад, яму дадуць магчымасці для развіцця



Прыпяцкае Палессе можа злучыць два берагі беларускай эканомікі — дзяржаўны і прыватны.

**Чарговае пасяджэнне Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Беларусі было прысвечана ўдзелу прыватнага бізнесу ў комплексным выкарыстанні прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся. Пасля наведвання некалькіх паспяховых прадпрыемстваў рэгёна ўдзельнікі Савета ўпэўніліся, што многае залежыць ад таленту бізнесмена. І галоўнай высновай пасяджэння стала аксіёма — мясцовыя органы ўлады павінны ствараць максімальна камфортныя ўмовы для развіцця паспяховага бізнесу ў краіне.**

### ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ПА МАКСІМУМЕ

Па словах **намесніка прэм'ер-міністра Беларусі і старшыні Савета Пятра ПРАКАПОВІЧА,** дзяржаўная праграма па развіцці Прыпяцкага Палесся мае вялікае значэнне. Гэты рэгіён аб'ядноўвае чатыры раёны Гомельскай вобласці і тры — Брэсцкай. «Рэалізоўвацца праграма павінна не толькі за кошт дзяржаўных інвестыцый, але і прыватнага сектара. У гэтым рэгіёне для развіцця прадпрымальніцтва ёсць вялікія магчымасці. Іх рэалізацыя абяцае значныя вынікі не толькі для Прыпяцкага Палесся, але і краіны ў цэлым», — лічыць Пётр Пракаповіч.

«У Беларусі больш за 110 тысяч прыватных прадпрыемстваў, але яшчэ шмат рэзерваў для іх развіцця. Не выкарыстоўваюцца яны часцей за ўсё з-за таго, што наша ўлада на месцах не стварае ўмовы, каб таленавітыя бізнесмены, якія станоўча праявілі сябе, маглі развіваць свой бізнес», — заявіў Пётр Пракаповіч. Прыкладаў паспяховага бізнесу шмат, галоўная задача — распаўсюджваць гэты вопыт па краіне. «У Беларусі прыватны сектар займае адну трэць эканомікі; напрыклад, заўтра ён зойме больш за палову — дзяржаве трэба максімальна выкарыстоўваць яго магчымасці і спрыяць развіццю», — упэўнены намеснік прэм'ер-міністра.

### НАФТА ЗНІКНЕ, А ЗЯМЛЯ ЗАСТАНЕЦЦА

Пётр Пракаповіч падкрэсліў, што стварэнне паспяховых прадпрыемстваў дае новыя працоўныя месцы, а значыць, дазваляе захоўваць моладзь у рэгіёне і павялічваць колькасць насельніцтва. «У сямі раёнах Прыпяцкага Палесся, на жаль, колькасць насельніцтва пакуль не павялічваецца, а наадварот, крыху зніжаецца. Гэта сведчыць аб тым, што ўлада і бізнес разам не здолелі стварыць патрэбныя і камфортныя ўмовы для прыцягнення новых кадраў і захавання наяўных».

Напрыклад, у Тураве нядаўна з'явіўся малочны камбінат з самым сучасным абсталяваннем. Выпускаюць там звышмодныя сыры — мацарэлу і іншыя. Як быццам жалезная гарантыя новых працоўных месцаў. Аднак прадпрыемства сёння працуе не на поўную магутнасць (усяго на 40%) з-за адсутнасці сыравіны. Такое адчуванне, што бізнес-план трошкі недапрацавалі. «З гэтым трэба змагацца прадстаўнікам бізнесу і ўлады сумесна», — лічыць намеснік кіраўніка ўрада.

У той жа час ёсць прыклады выдатна прадуманай стратэгіі развіцця бізнесу. Сялянская гаспадарка Міхаіла Шруба зарабляе нядрэнныя грошы і пастаянна ўкладвае іх у сваё развіццё — то новыя сховішчы пабудуюць, то тэхніку сучасную закупяць. Пётр Пракаповіч падкрэсліў, што калі б усе гаспадаркі такога плана мелі гадавую выручку на аднаго работніка на сяле, як у гаспадарцы гэтага бізнесмена, то Беларусь мела б не менш за 25 млрд еўра выручкі ад рэалізацыі сельгаспрадукцыі. А гэта ў разы больш, чым сёння. Увогуле, намеснік прэм'ер-міністра бачыць у зямлі самы вялікі скарб Беларусі — скажам, нафта ці газ могуць знікнуць, а зямля заўсёды застанецца. «З гэтага вынікае выснова: трэба досвед такіх таленавітых кіраўнікоў выкарыстоўваць і ствараць для іх максімальна камфортныя ўмовы, а таксама шукаць тых, хто зможа так працаваць. Галоўнае — вынік і эфектыўнасць працы, таму трэба падтрымліваць ініцыятыву таленавітых прадпрымальнікаў. Калі мы бачым, што на справе кіраўнік недзяржаўнага прадпрыемства паказаў добры прыклад, значыць, трэба даваць яму магчымасці для развіцця».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 450/С-1096 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада), площадью 400,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. В. Крайнего, 13. Составные части и принадлежности: подвал. |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425450100001008135, площадью 0,0252 га (назначение – обслуживание здания склада), расположенный по адресу: г. Слоним, ул. В. Крайнего, 13. Примечания – земельный участок имеет ограничения (обременения): земельный участок, находящийся в водоохраной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0252 га. |
| **Начальная цена продажи** | 267 250 821 (двести шестьдесят семь миллионов двести пятьдесят тысяч восемьсот двадцать один) белорусских рублей без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 13 362 541 (тринадцать миллионов триста шестьдесят две тысячи пятьсот сорок один) белорусский рубль |
| **Продавец** | Слонимский филиал Гродненского областного потребительского общества, г. Слоним, ул. Маяковского, 6, тел. 8-01562-215-91 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |
| **Аукцион состоится 31 октября 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.** | |

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 27 октября 2014 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**





## Напярэдадні ацяпляльнага сезона ў Беларусі распачынаецца пажарна-прафілактычная акцыя

# ЧАКАЙЦЕ Ў ГОСЦІ ВЫРАТАВАЛЬНІКАЎ

Халодны час года, на жаль, багаты на пажары. Яно і не дзіўна — людзі інтэнсіўна карыстаюцца электранагравальнымі прыборам, што ставарае дадатковую нагрузку на сеткі. Сваю лепту ў трагічную статыстыку ўносіць і неахайнае карыстанне печамі...

— Менавіта таму ў кастрычніку мы праводзім традыцыйную пажарна-прафілактычную акцыю, — кажа **начальнік аддзела арганізацыі прафілактычнай работы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Руслан ЛІХАМАНАЎ**. — Прыемна зазначыць, што сёлета да нас падключыўся шэраг ведамстваў, якія з'яўляюцца суб'ектамі прафілактыкі. Гэта міністэрствы па ўнутраных справах, адукацыі, працы і сацыяльнай абароны, інфармацыі, энергетыкі і жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У межах сваёй кампетэнцыі іх супрацоўнікі зоймуцца выяўленнем магчымых прычын узнікнення пажару і прымуць меры да іх ліквідацыі.

Зразумела, што ўсіх рэсурсаў недастаткова, каб правесці індывідуальную працу з кожным грамадзянінам краіны. Аднак гэта магчыма зрабіць з групай рызыкі. Да яе адносяцца сем'і, у якіх выхоўваюцца малалетнія дзеці; пенсіянеры і інваліды, якія жывуць адны, а таксама людзі, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Па статыстыцы, большасць пажараў адбываецца па віне людзей, якія напярэдадні былі нецвярозымі...

Далучыцца да акцыі можа кожны чалавек. Няспраўныя печы і электраправодку неабходна тэрмінова адрамантаваць. І не забудзьцеся пра аўтаномны пажарны апавяшчальнік. А калі ён у вас ужо стаіць, то праверце яго працаздольнасць. Рызыка гібелі чалавека ў памяшканні, дзе ўстаноўлены апавяшчальнік, на 80 працэнтаў ніжэйшая. І хто ведае, можа, здарыцца так, што аднойчы гэты апарат уратуе жыццё і вам?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■

■ Факт

# ПАНЧОХІ АДДАЛІ Ў ПРЫВАТНЫЯ РУКІ

**Каля 20% дзяржаўных каштоўных папер (30815 акцый) статутнага фонду акцыянернага таварыства “Брэсцкі панчошны камбінат” на агульную суму 39 млрд рублёў былі прададзены прыватнай фірме “Контэ Спа”.**

Продаж гэтага пакета акцый ажыццяўляецца на ўмовах інвеставання на працягу трох гадоў у статутны фонд брэсцкага камбіната грашовых сродкаў не менш за 5 млн долараў. Вызначаны аб’ём інвестыцый будзе выкарыстоўвацца на рамонт і мадэрнізацыю абсталявання камбіната, на фінансаванне маркетынгавых мерапрыемстваў, а таксама для забеспячэння экспарту прадукцыі брэсцкага вытворцы ў аб’ёме на суму не менш як 7 млн долараў у год. Дагавор куплі-продажу пакета акцый прадугледжвае і захаванне сацыяльных гарантый работнікам айчыннага прадпрыемства.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ПАПЕРА НА ВЕЦЕР

### У МІНСКІМ РАЁНЕ ЗГАРЭЛА КАЛЯ 30 ТОН МАКУЛАТУРЫ

Пажар здарыўся ўвечары ў вёсцы Калядзічы на адкрытай пляцоўцы ТДА «Другматэрыялы-1». Другасная сыравіна была ўкладзена россыпам вышынёй каля чатырох метраў на пляцоўцы памерам 20х50 метраў. Тэрыторыя з аднаго боку агароджана, меліся вартаўнікі. У выніку пажару агонь знішчыў каля 30 тон адсартаванай макулатуры на плошчы 15 квадратных метраў. Да прыбыцця падраздзяленняў МНС работнікі прадпрыемства тушылі полымя падручнымі сродкамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Рэха Першай сусветнай

# УЖО НЕ ЗАБЫТАЯ ВАЙНА...

**Падлічыць дакладна колькасць ахвяр і герояў падзей стагадовай даўнасці складана. А вось захаваць пра іх памяць — магчыма**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Мемарыял памяці ахвяр Першай сусветнай вайны сёлета быў урачыста адкрыты ў Смаргоні. Гэта першы маштабны мемарыяльны комплекс, прысвечаны падзеям стагадовай даўніны.**

**Зноў гаварылі пра вайну. На гэты раз — Першую сусветную. І яшчэ будуць гаварыць. Чатыры гады дакладна — да таго часу, калі амаль увесь свет адзначыць стагоддзе заканчэння аднаго з найбуйнейшых узброеных канфліктаў чалавецтва. А потым, як паказвае жыццё, зноў настане зацішша... Таму трэба выкарыстоўваць, як той казаў, момант. Што і робяць многія беларусы. Здзяйсняюць навуковыя даследаванні, пішуць кнігі, ствараюць помнікі... Бо разумеюць, што калі не цяпер, то ніколі. То забудуць... Хоць так ужо і было — доўгі час Першая сусветная вайна знаходзілася там, дзе пануе бяспамяцтва і маўчанне.**

Параўнальна нядаўна пачалі ўспамінаць, сталі гаварыць. За даволі кароткі час зроблена нямала. А можа, нават шмат. Што канкрэтна, навукоўцы, гісторыкі, журналісты, краязнаўцы і ўсе тыя, хто займаецца гэтай тэмай, расказалі падчас «круглага стала» «Першая сусветная. Вяртанне памяці», які адбыўся ў пасольстве Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Паслухаем і мы...

**Сёння мы не можам падлічыць забітых, зрабіць гэта нават з дакладнасцю да тысячы не атрымаецца і ў далейшага пакалення гісторыкаў.**

— У архівах краіны, у асноўным, у трох з іх — у Нацыянальна-гістарычным у Мінску, Нацыянальна-гістарычным у Гродне і Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь — захаваліся дакументы, звязаныя з перыядам Першай сусветнай вайны, — расказаў **дырэктар дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Уладзімір АДАМУШКА**. — Большасць гэтых дакументаў змяшчае інфармацыю аб становішчы на акупаванай тэрыторыі. Што тычыцца звестак аб ваенных дзеяннях, то яны сустракаюцца фрагментарна. Гэты блок дакументаў захоўваецца ў Ваенна-гістарычным архіве Масквы.

Калі больш дэталёва, то ў айчынных архівах можна знайсці дакументы, звязаныя са становішчам мірнага насельніцтва ў перыяд вайны, бежанствам на тэрыторыі Беларусі, стратамі мірнага насельніцтва. Аб гэтай гістарычнай спадчыне ведаюць не ўсе. Таму, каб інфармацыя стала даступнай шырокай грамадскасці — вядома, зацікаўленай — архіўная служба краіны займаецца выданнем дакументаў. Сярод апошніх твораў — зборнік дакументаў «Беларусь у гады Першай сусветнай вайны», карта вайсковых пахаванняў на тэрыторыі краіны ў час ваеннага ліхалецця, якая стала ў такім ключы першай у Еўропе, калі не ў свеце.

**Аўтар шматлікіх кніг па тэме Першай сусветнай вайны Вячаслаў БАНДАРЭНКА** прывёў некалькі міфаў, якія тычацца ўспрымання Вялікай вайны айчыннымі сродкамі масавай інфармацыі. «На адным з беларускіх каналаў 1 жніўня гэтага года я пачуў, што ў часы Першай сусветнай вайны ў нашай краіне былі забіты кожны сёмы жыхар, — падзяліўся гісторык і журналіст. — Знайшоўшы звесткі аб тым, колькі людзей было ў беларускіх губернях напярэдадні вайны, я прыйшоў да высновы, што наша тэлебачанне хоча, каб мы верылі, што ў Першую сусветную тут загінулі мільён чалавек. На самой справе дакладных, са спасылкай на архіўную крыніцу, лічбаў пакуль не існуе. Сёння мы не можам падлічыць забітых, зрабіць гэта нават з дакладнасцю да тысячы не атрымаецца і ў далейшага пакалення гісторыкаў. Лічыць гэта фальсіфікацыяй? Напэўна, не. Гэта звычайная прынада для гледачоў».

З той жа «оперы» і наступныя міфы. Расказы, якія неаднойчы даводзілася чуць, у тым ліку і ў афіцыйных выступленнях, пра паэта Аляксандра Блока, які быццам змагаўся ў гады вайны на тэрыторыі Беларусі. Як сцвярджае спадар Бандарэнка, рускі пісьменнік з агідай і абурэннем ставіўся ўвогуле да ваеннай службы. І ў ніякіх бітвах, натуральна, ён не ўдзельнічаў, бо знаходзіўся ў глыбокім тыле. Узгадаў выступоўца і мемарыял на Мінскіх брацкіх могілках, які першапачаткова ствараўся ў гонар ахвяр Першай сусветнай вайны. А там, між іншым, пахаваны афіцэры і салдаты, якія па сутнасці ахвярамі не з'яўляюцца, яны — удзельнікі і героі той вайны. Сёння, дарэчы, у назве мемарыяла іншая фармулёўка — у гонар герояў і ахвяр Першай сусветнай вайны.

Дыскусійнае пытанне — і праблема вывучэння вопыту Першай сусветнай вайны ў сістэме адукацыі Беларусі. «Для ваеннага чалавека гэты вопыт цікавы і запатрабаваны, бо шмат момантаў у гады Першай сусветнай вайны звязана з развіццём ваеннай справы і мастацтва баявых дзеянняў, — патлумачыў **прафесар кафедры ваеннай стратэгіі факультэта Генеральнага штаба Узброеных сіл краіны Сяргей ЛЮТКО**. — У нашых даследаваннях вельмі цяжка абапірацца на першакрыніцы, бо ўсе звесткі, якія тычацца баявых дзеянняў, знаходзяцца ў Расійскай Федэрацыі. Таму мы часта звяртаемся да прац нашых расійскіх калег. Выкладаючы ў Ваеннай акадэміі, я і мае калегі, на жаль, сутыкаемся яшчэ і з такой праблемай, як практычная адсутнасць у курсантаў ведаў аб Першай сусветнай вайне. У наш час, сапраўды, гэтую вайну называлі імперыялістычнай, несправядлівай, але, прынамсі, яе вывучалі. Цяперашнія курсанты і студэнты валодаюць павярхоўнымі ведамі аб ёй».

**Дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Аляксандр ГРОНСКІ** ведае, у чым тут прычына. «Прагледзеўшы школьныя дапаможнікі па гісторыі, я ўбачыў, як там адлюстравана Першая сусветная вайна. Такія словы, як «патрыятызм», «абарона Айчыны» і падобныя пішуцца ў двукоссі. Калі параўноўваць з савецкімі падручнікамі, то я прыйшоў да высновы, што нават тады негатыву аб той вайне было значна менш, чым цяпер».

Аднак Першую сусветную вайну, як вядома, можна вывучаць не толькі па падручніках і архіўных звестках. Сёння, на шчасце, існуе шмат альтэрнатыў далучыцца да падзей стагадовай даўніны. Напрыклад, праз фотадзымкі і паштоўкі. Вядома, іх няма ў асабістых фотаальбомах, рэдка сустрэнеш і ў музеях. Але так было да нядаўняга часу. У музеях і ў некаторых іншых установах краіны, прычым не толькі ў сталіцы, пачалі з'яўляцца экспазіцыі па тэме Першай сусветнай вайны. Аўтарства большасці з іх належыць вядомаму **калекцыянеру, аўтару кнігі «Беларусь праз фотааб'ектыў нямецкага салдата. 1915—1918 гг.» Уладзіміру ЛІХАДЗЕДАВУ**. Адначасова краязнаўца можа пры жаданні наладзіць нават некалькі выстаў: яго калекцыю складаюць каля 30 тысяч арыгінальных фотадзымкаў і паштовак, прысвечаных падзеям Першай сусветнай вайны. Такой спадчыны няма ні ў адной бібліятэцы свету!

— Большасць фотадзымкаў і паштовак зроблена нямецкімі вайскоўцамі, — расказаў філакартыст. — Менавіта дзякуючы ім мы можам бачыць, як выглядалі беларускія землі ў гады Першай сусветнай вайны. Калі казаць аб расійскай прыналежнасці калекцыі, то яна налічвае каля 10 тысяч арыгіналаў. Па частках давялося збіраць фотаархіў 2-га Каўказскага кавалерыйскага корпуса, які налічвае больш за 800 фотадзымкаў, што паказвае ўвесь шлях гэтага вайсковага падраздзялення.

Калекцыю Уладзіміра Ліхадзедава па Першай сусветнай можна падзяліць на некалькі тэматычных раздзелаў: вайсковыя пахаванні, ваенныя дзеянні, бежанства, абмен палоннымі, братанне салдат, праваслаўе, побыт... Частку гэтых унікальных фотадзымкаў і паштовак калекцыянер гатовы перадаць у музей Першай сусветнай вайны, які ствараецца ў вёсцы Забродзье, што на Вілейшчыне.

Стваральнікам гэтага музея з'яўляецца **вядомы мастак Барыс ЦІТОВІЧ**, які не адзін год свайго жыцця прысвяціў тэме Першай сусветнай вайны. Пераехаўшы ў глыбінку са сталіцы, ён за даволі непрацяглы перыяд аднавіў некалькі брацкіх могілак і іншых аб'ектаў у рэгіёне, звязаных з Вялікай вайной. Пра гэтага ўнікальнага чалавека і яго падзвіжніцкую дзейнасць мы пісалі не раз. Спадзяёмся, яшчэ шмат будзем расказваць: у Барыса Цітовіча нямала планаў, якія разам са сваімі аднадумцамі ён рэалізуе ў бліжэйшы час.

«Зараз мы працуем над стварэннем помніка ў вёсцы Залессе, — падзяліўся лаўрэат прэзідэнцкай прэміі «За духоўнае адраджэнне». — Таксама актыўна вядзецца работа па стварэнні помніка ў Вілейцы пры ўваходзе на гарадскія могілкі, дзе пахаваны воіны, якія вызвалялі горад у верасні 1915 года. З'яўляюцца новыя крыжы на магілах воінаў Першай сусветнай вайны. Сіламі культурна-гістарычнага фонду памяці Першай сусветнай вайны «Крокі» мы рыхтуемся ўсталяваць помнікі на 12 аб'ектах Вілейскага, Валожынскага і Маладзечанскага раёнаў».

Такім чынам, сабраўшыся за «круглым сталом» ці ў іншым фармаце прыйдзецца яшчэ не раз. Спадзяемся, што даведаемся шмат новага і цікавага, каб больш ніхто і ніколі Першую сусветную не назваў забытай вайной.

**Вераніка КАНЮТА**

■ Год гасціннасці

# КАРАБЕЛЬ ВІКІНГАЎ АДЧАЛІЦЬ... З ЗАРЭЧНАЙ ВУЛІЦЫ

**Гаспадары кобрынскіх аграсядзіб аб'ядналіся ў справе аднаўлення гісторыі, культуры і абрадаў свайго краю**

**У аграсядзібе пад Кобрынам, якая называецца «На Зарэчнай вуліцы», будуюць карабель вікінгаў. Гэтая сядзіба адрозніваецца тым, што турыстам на ёй, акрамя традыцыйнага адпачынку, прапануюць нешта асаблівае. Тут праводзяць мерапрыемствы ў палескіх традыцыях, аднаўляюць старадаўнія, яшчэ дахрысціянскія абрады, ахвотных водзяць да каменнага лежака — галоўнай славутасці навакольных вёсак.**

ЦЯПЕР вось на Зарэчнай узводзяць імітацыю плаўсродку далёкіх вікінгаў. Гаспадыня сядзібы Ала Палікарпук нагадвае, што менавіта праз нашы мясціны пралягаў некалі шлях з варагаў у грэкі. У XVI стагоддзі па Мухаўцы вазілі бурштын. Вось і вырашылі гаспадары сядзібы прапанаваць сваім пастаяльцам воднае падарожжа ў мінулае. Маршрут ужо распрацаваны, ён складзе прыкладна 35 кіламетраў.

Карабель будуе муж Алы Сяргей. Кансультацыі па абыходжанні з дрэвам ён атрымаў у знаёмых рамеснікаў. Таму паступова, дошка за дошкай, складваецца аснова судна. Дапамагаюць парадай і актывісты ваенна-гістарычнага клуба. Важна не толькі аформіць і ўпрыгожыць карабель «пад даўніну», але і правільна апрацаваць драўніну, каб не гніла ў вадзе. Ала Аляксееўна падкрэслівае, што іх судна — не рэканструкцыя, а толькі імітацыя карабля вікінгаў, на ім плануецца значную частку элементаў зрабіць з пластыку. У дракары, калі ён будзе гатовы, памесціцца паўтара дзясятка чалавек. Спуск на ваду запланаваны вясной-летам 2015 года.



Будуецца дракар.



На свяце Купалля (на першым плане — Ала Палікарпук).

Ала Палікарпук гаворыць, што ў справе прываблівання турыстаў сёння мала адной беларускай кухні — трэба прыдумляць нешта іншае. Таму суседзі — гаспадары сядзіб, іншыя зацікаўленыя людзі — стварылі аб'яднанне «Мухавецкая кумора». Разам з актывістамі ваенна-гістарычнага клуба, іншых грамадскіх арганізацый сябры «Куморы» адраджаюць народныя абрады, звычаі, палескія традыцыі. Святы, якія праводзяцца на базе турыстычных сядзіб па чарзе, збіраюць шмат гасцей і гледачоў.

Ідэю Ала Палікарпук разам з калегамі падгледзелі ў Еўропе, калі наведвалі тамтэйшыя аграсядзібы. У іх распрацаваны цэлыя маршруты з улікам спецыфікі кожнай сядзібы. І тураператары ахвотна возяць людзей па маршруце. Кожны турыстычны аб'ект прапануе свой спецыфічны прадукт: ад вырабу і дэгустацыі піва да майстар-класаў па народных танцах. Вось і ў Кобрынскім раёне вырашылі аб'яднацца, бо ў адзіночку цяжэй ажыццявіць які-небудзь значны праект.

**...Каб прываблівацць турыстаў, сёння мала адной беларускай кухні — трэба прыдумляць нешта іншае. Таму суседзі — гаспадары сядзіб, іншыя зацікаўленыя людзі — стварылі аб'яднанне «Мухавецкая кумора».**

Так, на суседняй аграсядзібе праходзяць традыцыйныя беларускія Каляды, Сёмуха, іншыя святы. Ала і Сяргей Палікарпукі выбралі для сябе дахрысціянскія абрады і звычаі нашых краёў. Гэтым летам у сядзібе «На Зарэчнай вуліцы» прайшло свята Купальскай ночы. Адбылося яно 21 чэрвеня, у самую кароткую ноч. Сабралася шмат гасцей. Разам з клубам гістарычнай рэканструкцыі «Перунова кола» гаспадары сядзібы падрыхтавалі цікавую праграму. Госці былі ў захапленні: усе разам вадзілі карагоды, збіралі зёлкі, шукалі папараць-кветку, а таксама частаваліся рознымі прысмакамі, куплялі сувеніры, загадзя падрыхтаваныя рамеснікамі.

Зімой рыхтуецца яшчэ адно цікавае мерапрыемства. Каля 30 тураператараў заявілі пра жаданне паўдзельнічаць у ім, каб вывучыць магчымасць уключэння сядзіб у маршруты.

Ала Аляксееўна разважае і пра тое, што апошнім часам асабліва турбуе яе і калег, прыхільнікаў сапраўднага турызму. Некаторыя гаспадары сядзіб выбралі найлягчэйшы шлях заробкаў і ператварылі свой бізнес у рэстаранны. Асноўны даход яны атрымліваюць ад банкетнай залы, дзе праходзяць карпаратывы, сямейныя святы, гуляюць кампаніі. Таму нярэдка і раздаюцца папрокі ў бок агратурызму: маўляў, сядзібы становяцца месцам калектыўных п'янак.

Ала і яе аднадумцы катэгарычна супраць такіх падыходаў. Яны хочуць зрабіць турызм пазнавальным, цікавым, прапагандаваць нашу гісторыю і культуру. Вось у гэтым кантэксце і разглядаецца будаўніцтва незвычайнага карабля.

ДОМ Палікарпукоў стаіць у такім маляўнічым месцы, што тут, здаецца, сама прырода падказала пра мэтазгоднасць заняцца агратурызмам. Сядзіба губляецца сярод дрэў. Побач — рака. Ала і Сяргей з тых гараджан, якія у свой час пакінулі горад і перабраліся жыць у вёску. Купілі старэнькую хату недалёка ад Кобрына, падрамантавалі яе і пачалі ўзводзіць дом. А тая старая хаціна, якой 110 гадоў, зараз увайшла ў іх агульны, можна сказаць, турысцкі комплекс. Тут зрабілі рамонт. У адным пакоі абсталявалі невялічкую банкетную залу, у другім можна размяшчаць гасцей.

«Канёк» гаспадыні з «Зарэчнай вуліцы» — гэта кухня. Стала традыцыяй на яе сядзібе праводзіць розныя кулінарныя конкурсы. Бывалі на такіх мерапрыемствах гаспадыні з блізкага і далёкага замежжа. «Такія сустрэчы вельмі ўзбагачаюць нас, мы вучымся адна ў адной», — гаворыць Ала Палікарпук. — Цяперашні турыст разборлівы, ён хоча не проста паесці, але і атрымаць эстэтычную асалоду ад абеду ці вячэры». Асновай свайго стала яна зрабіла беларускую кухню. Гасцям найперш прапануе мачанку, дранікі, бульбяныя скрылькі, галубцы, хатнія каўбаскі, бабку. Ад іншых гаспадынь на конкурсах навучылася гатаваць курыцу з грыбамі ў кляры, цэпеліны-дранікі з курынай начынкай і шмат іншага.

З харчаваннем гасцей бываюць розныя сітуацыі, ледзь не анекдатычныя. Аднойчы ў Палікарпукоў прыпыняліся галандскія веламарафонцы. Ала старалася, гатавала з улікам таго, што людзі сотні кіламетраў педалі круцяць, павінны адпаведна і падмацоўвацца. Ды ледзь не ў апошні момант ёй патэлефанавала гаспадыня сядзібы, дзе яны начавалі напярэдадні. У групе веласіпедыстаў былі вегетарыянцы, і яны засталіся практычна галоднымі. Бо ранейшыя гаспадары разважалі, як яна, і ўсё гатавалі з мясам. Бедныя вегетарыянцы харчаваліся адным хлебам з памідорамі. Да Алы яны ўжо прыехалі ледзьве ногі цягнучы. Але яна паспела — і слоены торт з грыбамі пабудавала, і грэцкую кашу ў гаршчочках прыгатавала, і агародніну... Ну і ад'ядаліся яны ўжо!

А з японскай турысткай было ўсё наадварот. Прыехала 21-гадовая падарожніца з вялікім заплечнікам. Мовы не ведае ні рускай, ні англійскай. Чым карміць японку, Ала нават не здагадвалася. Вырашыла пакласці ўсяго патроху: нешта ж яна захоча выбраць. Так і зрабіла. А госця, маленькая, худзенькая, сядзела і дзве гадзіны ела... Нават кавалачка хлеба не засталося. Потым старэйшая дачка недзе прачытала, што ў іх такі звычай, трэба з'есці ўсё, каб не пакрыўдзіць гаспадароў. Многаму даводзіцца вучыцца падчас стасункаў з людзьмі, у тым ліку і нейкім нацыянальным асаблівасцям.

ЛЮБІЦЬ Ала прымаць гасцей. Кажа, што цікава размаўляць з прадстаўнікамі розных краін: узбагачаешся, вучышся. У яе пабывала практычна ўся Еўропа, былі турысты з Канады, Аўстраліі, Ізраіля, краін Афрыкі. Аўстралійцы ў спёку падышлі да рэчкі і пытаюць: «Хто нас будзе кусаць у гэтай рацэ?» Давялося тлумачыць, што кракадзілаў у нас няма, піраній таксама, а шчупакі і карасі вельмі мірныя істоты, ніхто не ўкусіць, хоць прасядзі ў вадзе паўдня.

Ізраільскія турысты шукалі свае карані. Іх продкі некалі выехалі з гэтых мясцін, і людзям хацелася знайсці хаця б тое месца, дзе стаяла родная вёска дзядоў. Кітайскія госці вельмі ўпадабалі выступленне рыцарскага клуба з Кобрына. Усе, каму давялося пабыць на святах, арганізаваных «Мухавецкай куморай», выказвалі задавальненне.

Замежных гасцей Ала любіць за тое, што беражліва ставяцца да прыроды, да раслін. Кожную травінку, кожную краску, кожны грыб будуць разглядаць, фатаграфаваць, а не зачэпяць. Любіць, калі прыязджаюць людзі адукаваныя, зацікаўленыя паглядзець нашы славутасці, выдатныя мясціны. Цяпер, калі кобрынскія энтузіясты аб'ядналіся, лічыць старшыня раённага грамадскага савета па развіцці турызму Ала Палікарпук, такіх турыстаў будзе больш.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# СЁСТРЫ МІЛАСЭРНАСЦІ І АГІТПЛАКАТЫ

**У Брэсце адкрылася выстава, прысвечаная 100-годдзю Першай сусветнай вайны**

**Расійскі цэнтр навукі і культуры ў Брэсце, які ўрачыста адкрылі ў чэрвені падчас візіту ў горад над Бугам старшыні Дзярждумы Расіі Сяргея Нарышкіна, правёў першае маштабнае мерапрыемства. Тут адбылася прэзентацыя выставы, прысвечанай 100-годдзю Першай сусветнай вайны.**

Кіраўнік расійскага цэнтра навукі і культуры Алена Маслава адзначыла, што сто гадоў таму адбыліся карэнныя перамены ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека. Падчас вайны былі ўпершыню выкарыстаны танкі і цяжкія аэрастаты, лінкоры і авіяцыя, кулямёты і агнямёты, газавыя атакі. Такім чынам, дасягненні цывілізацыі ператварыліся ў канвеер для знішчэння людзей. Як вядома, даволі доўга пра тую крывавую і жорсткую вайну амаль не гаварылі. Але прыйшоў час аддаць даніну подзвігу салдат і афіцэраў Першай сусветнай і нагадаць яшчэ раз, які кволы мір на Зямлі, як яго трэба берагчы.

На выставе прадстаўлена шмат фотаматэрыялаў пра падзеі таго часу. Ёсць стэнд, які склалі здымкі жанчын з царскай сям'і. Гэтыя жанчыны працавалі сёстрамі міласэрнасці ў шпіталях і займаліся дабрачыннасцю.

Адной з самых цікавых частак экспазіцыі, несумненна, сталі агітацыйныя плакаты (1914—1916 гадоў), якія былі найбольш дзейсным сродкам прапаганды і служылі ўмацаванню баявога духу воінаў.

Выстава працягнецца да канца кастрычніка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


## Правила проведения рекламной игры «Можно все – можно частями!»

**Настоящие Правила проведения рекламной игры (в дальнейшем – «Правила»), направленной на стимулирование потребительского спроса на сопутствующие товары и услуги, реализуемые на автозаправочных станциях предприятий по обеспечению нефтепродуктами, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть», а также на повышение интереса к программе «Заправляйся выгодно!», проводимой в указанных предприятиях, разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 г. № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Можно все – можно частями!» (далее – «Игра»).**

**1. Организатор**
Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Группа НЭФ» (далее по тексту – «Организатор»), зарегистрированное Минским горисполкомом 08.10.2012 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191769157. Юридический адрес: 220113, г.Минск, ул. Мележа, 5/1, офис 413 тел. 8017 237 16 19 УНП 191769157

**2. Наименование Игры**: «Можно все – можно частями!»

**3. Территория проведения Игры:** автозаправочные станции предприятий по обеспечению нефтепродуктами, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть», расположенные на территории Республики Беларусь (далее – АЗС «Белоруснефть»).

**4. Срок начала и окончания Игры**
Игра проводится в период **с 1 октября 2014 года по 31 декабря 2014 года.**

**5. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых, проводится Игра**
Игра проводится в целях стимулирования реализации товаров и услуг (включая услуги кафе, автомойки, шиномонтажа, пылесоса, долива жидкости в бачок омывателя, СТО, чистки ковриков), реализуемых на АЗС «Белоруснефть», за исключением нефтепродуктов, алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий (далее – «Сопутствующие товары и услуги»).

**6. Призовой фонд Игры**
Призовой фонд Игры формируется за счет денежных средств, следующих Заинтересованных лиц:
Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт»; Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Витебскоблнефтепродукт»; Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт»; Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гроднооблнефтепродукт»; Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Минскавтозаправка»; Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт»; Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Могилевоблнефтепродукт»; Открытое акционерное общество «Лиданефтепродукт»; Открытое акционерное общество «Пуховичинефтепродукт».
Общий размер призового фонда составляет: 342 079 091 (Триста сорок два миллиона семьдесят девять тысяч девяносто один) белорусский рубль.

Призовой фонд Игры включает призы, указанные в Таблице 1.

| № п/п | Наименование приза | Призовая стоимость за единицу, бел. руб. | Кол-во, шт. | Всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Главный приз – электронная топливная карта I типа стоимостью 93 600 рублей с зачисленными на нее денежными средствами в размере 200 000 000 белорусских рублей для заправки на всех АЗС «Белоруснефть» дизельным топливом либо бензином марки АИ-95 (далее – «Топливная карта») и денежное вознаграждение в сумме 27 285 491 белорусских рублей. | 227 379 091 | 1 | 227 379 091 |
| 2 | Дополнительный приз – электронная топливная карта II типа стоимостью 93 600 рублей с зачисленными на нее денежными средствами в размере 10 000 000 белорусских рублей для заправки на всех АЗС «Белоруснефть» дизельным топливом либо бензином марки АИ-95 (далее – «Топливная карта») и денежное вознаграждение в сумме 1 376 400 белорусских рублей. | 11 470 000 | 10 | 114 700 000 |
| итого: | | | 11 | 342 079 091 |

Электронная топливная карта I типа, входящая в состав призового фонда Игры, действуют по 31 декабря 2019 года.
Электронные топливные карты II типа, входящие в состав призового фонда Игры, действуют по 31 декабря 2016 года.

**7. Условия участия в Игре**
Лицом, принимающим участие в Игре (далее – «Участник Игры»), может быть только резидент Республики Беларусь, любое дееспособное физическое лицо, достигшее 18-летнего возраста, являющееся участником программы «Заправляйся выгодно!», проводимой в сети АЗС «Белоруснефть», заполнившее анкету участника указанной программы (далее – «Анкета»), указав при этом свои контактные данные (номер телефона и адрес электронной почты), и имеющее в связи с таким участием накопительную информационно-учетную карту (в дальнейшем – «Карта»), которая определяет указанное лицо как участника данной программы.
Заполнив Анкету, Участник программы «Заправляйся выгодно!» дает согласие на участие в проводимых в рамках указанной программы акциях, в том числе розыгрышах призов.
Участниками Игры являются держатели Карт, приобретенных как до начала Игры, так и в период ее проведения.
Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором Игры, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. В Игре также не вправе принимать участие члены комиссии по проведению Игры (далее – «Комиссия»).
Для того чтобы принять участие в Игре, участнику программы «Заправляйся выгодно!» необходимо в период с 01 октября по 30 ноября 2014 года приобрести Сопутствующие товары и услуги на сумму 200 000 рублей и более. За каждую последующую сумму кратную 200 000 рублей, Участнику будет присваиваться порядковый номер для участия в розыгрыше.
При выполнении всех вышеуказанных условий участник программы «Заправляйся выгодно!» автоматически становится Участником Игры.

**8. Розыгрыши призов**
Розыгрыш призов проводится 16 декабря 2014 года. Розыгрыши проводятся в офисе Организатора по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 5/1, офис 413.
Розыгрыш призов проводиться в два этапа. I этап – розыгрыш главного приза. II этап - розыгрыш дополнительных призов.
Призы, которые может выиграть тот или иной Участник Игры, не зависят от величины суммы за приобретение Сопутствующих товаров при условии выполнения Участником обязательных условий Игры.
До начала розыгрыша Комиссия формирует список Участников, которые в период с 01 октября 2014 года по 30 ноября 2014 года выполнили условия Игры.
При этом в списке Участникам присваиваются порядковые номера с одинаковым количеством цифр в каждом номере. Согласно указанным номерам и будут определяться Участники, получающие призы (далее – «Победители»). Списки формируются в алфавитном порядке. Каждому участнику розыгрыша, согласно списку, присваивается порядковый номер для участия в розыгрыше. При полном совпадении фамилии, имени и отчества нескольких Участников номера присваиваются в порядке возрастания Карт таких Участников.
Устанавливается следующий порядок розыгрыша призового фонда и определения Победителей Игры.
Для проведения розыгрыша используется лототрон и 10 одинаковых непрозрачных шаров с цифрами от 0 до 9. Определение номеров Победителей происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона.
Для определения первой слева цифры номера каждого Победителя лицо, проводящее розыгрыш, помещает в лототрон шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера Участника согласно соответствующему списку. Шары перемешиваются, из лототрона путем случайной выборки извлекается шар, номер которого определяет искомую цифру. Для определения второй и последующих цифр номера Победителя в лототрон загружаются все десять шаров. После извлечения каждого шара производится проверка на соответствие полученной комбинации цифр номерам Участников согласно соответствующему списку. При отсутствии полученной комбинации цифр в номерах по списку извлеченный шар не возвращается в лототрон, а лицо, проводящее розыгрыш извлекает из лототрона следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация не совпадет с номерами Участников по списку. Ход и результаты каждого розыгрыша призов фиксируются в протоколе заседания Комиссии, который составляется и подписывается всеми присутствующими членами Комиссии в момент проведения розыгрыша. Решение Комиссии, касающееся результатов соответствующего розыгрыша, является окончательным, обязательным для всех Участников Игры и не может быть пересмотрено.

**9. Выдача призов Победителям Игры**
Организатор в срок не позднее 5 (пяти) рабочих дней с момента проведения розыгрыша призов связывается с каждым Победителем по телефону и по электронной почте, указанным в его Анкете, после чего по адресу, указанному Победителем, высылает последнему письмо с информацией о победе в Игре, а также о месте, порядке и сроках выдачи призов.
Выдача призов Победителям производится Организатором Игры по рабочим дням с 18 по 26 декабря 2014 года в рабочее время с 10:00 до 13:00 и с 15:00 до 18:00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 5/1, офис 413, ООО «Группа НЭФ». Телефон для справок: 8 (017) 237-16-19.
Для получения приза Победитель должен предъявить свой паспорт, расписаться в получении приза и забрать приз. При выдаче приза фамилия, имя, отчество и дата рождения Победителя по паспорту сверяются с соответствующими данными, указанными в Анкете Победителя. Приз выдается в случае соответствия указанных данных.
В случае если Победитель не может прибыть за получением приза лично, приз может получить его представитель по предъявлении вместо паспорта Победителя своего паспорта и выданной Победителем нотариально удостоверенной доверенности (либо доверенности, которая в соответствии с законодательством Республики Беларусь приравнивается к нотариально удостоверенной). В доверенности должны быть указаны паспортные данные Победителя (фамилия, имя, отчество, дата рождения, номер и дата выдачи паспорта, орган, выдавший паспорт).
При выдаче призов Организатор в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, исчисляет и удерживает из стоимости приза за счет соответствующих денежных вознаграждений, входящих в его состав, и перечисляет в бюджет подоходный налог на сумму такого приза в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Организатор не оплачивает Победителям Игры и их представителям расходы, связанные с переездом к месту получения призов, расходы, связанные с транспортировкой призов после их передачи Победителям (их представителям), а также расходы, связанные с регистрацией и постановкой на учет призов в случаях, когда такая регистрация (постановка на учет) требуется согласно законодательству.
Призы не подлежат замене, выплата денежного эквивалента стоимости приза не производится.
При использовании Топливной карты, выданной в качестве приза, Победитель Игры принимает на себя следующие обязательства:
• пользоваться Топливной картой в соответствии с «Памяткой по работе с Топливной картой «Белнефтепродукт АЗС-Сервис» (выдается Победителю вместе с призом);
• в случае утери Топливной карты – в течение суток письменно сообщить об этом в РУП «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт», по адресу: 246003, г. Гомель, ул. Докутович, 57а, а также по телефону 8 (0232) 60-95-46 (по будним дням с 8:00 до 17:00);
• обеспечить конфиденциальность PIN-кода Топливной карты (выдается Победителю вместе с призом), а также не наносить (не прикреплять) PIN-код каким-либо образом на Топливную карту;
• не передавать Топливную карту в пользование третьим лицам.
Организатор Игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением приза и его эксплуатацией, возникшие после выдачи указанного приза Победителю либо его представителю.

**10. Публикация правил Игры, информация об Игре**
Настоящие Правила подлежат опубликованию в газете «Нефтяник» до начала Игры.
Сведения о результатах Игры будут опубликованы в газете «Нефтяник» не позднее 31 декабря 2014 года.
Информацию об условиях участия в Игре и ее проведении, а также о результатах розыгрышей призов можно получить в будние дни с 9:00 до 13:00 и с 14:00 до 18:00 по телефону: 8 (017) 237-16-19 или по адресу: 220113, г.Минск, ул. Мележа, 5/1, офис 413, а также на сайте azs.belorusneft.by.
Информацию о программе «Заправляйся выгодно!!» можно получить на сайте azs.belorusneft.by, а также на любой АЗС «Белоруснефть». Правила участия и Условия программы «Заправляйся выгодно!!» опубликованы на сайте azs.belorusneft.by.

**11. Состав Комиссии по проведению Игры**
Комиссия создается с целью объективного проведения Игры и розыгрыша призов в составе 5 (пяти) человек.
Состав Комиссии:
1. Романов Олег Борисович, директор ООО «Группа НЭФ» (председатель Комиссии);
2. Федорцов Александр Александрович, заместитель начальника отдела корпоративных продаж Управление нефтепродуктообеспечения РУП «Производственное объединение «Белоруснефть»;
3. Краснобаев Виталий Витальевич, редактор редакционно-информационного отдела РУП «Производственное объединение «Белоруснефть»;
4. Пруткова Екатерина Викторовна, менеджер по работе с клиентами ООО «Группа НЭФ»;
5. Мироненко Виталия Алексеевна, менеджер по работе с клиентами ООО «Группа НЭФ».

**12. Прочие условия**
Факт получения приза Победителем означает, что данный Победитель ознакомлен и полностью согласен с настоящими Правилами.
Получая приз, Победитель соглашается давать интервью либо сниматься для рекламных материалов, связанных с Игрой, без уплаты за это какого-либо вознаграждения, а также разрешает использование его имени, изображений, интервью и иных материалов о нем Организатором и любым Заинтересованным лицом в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с Игрой. Все права на подобные публикации и результаты съемок принадлежат Организатору и (или) Заинтересованным лицам по договоренности между ними.
Победители Игры, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для этого документы, предоставляемые Организатором.
Организатор не несет ответственности за качество и оперативность работы почтовых и телефонных служб.
Все возможные претензии Участников Игры в отношении организации Игры и условий передачи призов должны быть адресованы Организатору в письменном виде по адресу: 220113, г.Минск, ул. Мележа, 5/1, офис 413 , ООО «Группа НЭФ» или по телефону:
8 (017) 237-16-19 (в будние дни с 9:00 до 13:00 и с 14:00 до 18:00 часов).



БЕЛОРУСНЕФТЬ

Свидетельство о государственной регистрации игры №2434 от 23 сентября 2014 г.

■ Падзея

# УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ІАГАНА БАХА

**На адкрыцці фестывалю Юрыя Башмета Сяргей Крылоў іграў на скрыпцы свайго бацькі**

**Музыка Баха, Моцарта і Калігарыса прагучала на адкрыцці Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета ў Мінску. Гэтым канцэртам і пакладзены пачатак шэрагу выдатных музычных падзей. На адкрыцці Літоўскі камерны аркестр выконваў класіку і сучасную музыку пад скрыпку Сяргея Крылова, скрыпача і дырыжора, які саліраваў разам з мастацкім кіраўніком фестывалю піяністам Расціславам Крымерам.**

Сяргей Крылоў іграў на скрыпцы, якую ў 1996 годзе зрабіў яго бацька, вядомы скрыпічны майстар Аляксандр Крылоў у італьянскім горадзе Крэмона.

«Ужо шэсць гадоў я працую з Літоўскім камерным аркестрам. Тады здарылася неардынарная, імправізаваная сітуацыя: я прыехаў у Вільнюс з сольным канцэртам, іграў з літоўскім аркестрам. Так склалася, што некалькі канцэртаў у Вільні ішлі адзін за адным, і праз пару тыдняў пасля апошняга мне пазванілі з прапановай стаць галоўным дырыжорам Літоўскага камернага аркестра. Я яшчэ доўга думаў, каб пагадзіцца на гэтую ролю (пасадай я гэта не назваў бы). Цяпер мы робім 6-8 праграм за год. Для мяне асабіста і для Літоўскага камернага аркестра вялікі гонар выступаць у Мінску на фестывалі Юрыя Башмета», — гаворыць Сяргей Крылоў.

Пад сімфонію Моцарта на адкрыцці адбылося мультымедыйнае шоу з паказам на экране шэдэўраў жывапісу, напісаных сучаснікамі славутага кампазітара.

За час фестывалю прагучаць творы сучаснага кампазітара Сафіі Губайдулінай, якая будзе ганаровым госцем фестывалю, і маладога беларускага кампазітара Вольгі Падгайскай. Музычныя аматары змогуць паслухаць саліставу з Італіі — флейтыста Масіма Марчэла і кларнетыста Рыкарда Крачыла, ігру на фартэпіяна ірландца Бары Дугласа, каралеўскі аркестр Канцэртгебаў з Амстэрдама, выдатнага скрыпача Вадзіма Рэпіна ды іншых вядомых музыкантаў і музычных калектываў.

Сам Юрый Башмет будзе саліраваць і дырыжыраваць на закрыцці фестывалю 7 кастрычніка.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

# «Я не люблю, калі мяне параўноўваюць з Карстэн...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Крысціна, ты заваявала першае золата для Беларусі на гэтай юнацкай Алімпіядзе і першае ў гісторыі падобных спаборніцтваў у акадэмічным веславанні. Якія пачуцці былі пасля перамогі?***

— У першую чаргу вялікі гонар за краіну і за сябе. Спачатку наогул не верыла, што я гэта зрабіла. Да гэтай перамогі я вельмі доўга ішла, і аказалася, што 6 гадоў працавала нездарма. Увогуле, мне здаецца, што калі б гэта быў не першы медаль для Беларусі, то не было б столькі эмоцый, і, магчыма, я наогул бы не выйграла. Была б трэцяя ці чацвёртая. Сцяг, які ляжаў у лодцы, нашы трэнеры, якія крычалі на фінішы, — без гэтага я не дагнала б саперніцу. Быў фотафініш, нас раздзяліла доля сотых, мы аднолькава ішлі практычна ўсю дыстанцыю, але Бог вырашыў аддаць гэтую перамогу мне.

*Да гэтага ў Крысціны былі прызавыя месцы на юнацкіх чэмпіянатах свету і Еўропы, але золата Алімпійскіх гульняў пакуль з'яўляецца самай галоўнай перамогай маладой спартсменкі.*



Тата пра серабро нават і слухаць не хацеў, гэта ўсё вельмі ціснула на мяне, але з іншага боку, можа, чымсьці і дапамагло, таму што нішто не дазваляла мне здавацца. Пасля перамогі бацькі былі вельмі шчаслівыя, плакалі. Тата кажа, што ў гэты дзень у свеце не было чалавека больш шчаслівага, чым ён.

***— І ты плакала таксама...***

— Ды я наогул вельмі эмацыйны чалавек, мяне вельмі лёгка расчуліць. Лію слёзы ад банальнай меладрамы. Часта плачу... ад радасці. Добра, што толькі ад гэтага.

*Як гэта звычайна бывае ў паспяховых спартсменаў, Крысціна нарадзілася ў спартыўнай сям'і: тата займаўся плаваннем, але не выканаў нарматыў майстра спорту і захацеў, каб гэта зрабіла яго дачка, таму і аддаў дзяўчынку ў плаванне. Мама займалася многімі відамі спорту, адным з якіх быў парашутны: за яе плячыма мноства скачкоў. Аднак, як прызнаецца сама Крысціна, наўрад ці калі-небудзь яна паўторыць матулін подзвіг — вельмі баіцца вышыні. У акадэмічнае веславанне Крысціна, можна сказаць, трапіла выпадкова: падчас заняткаў плаваннем узніклі праблемы са здароўем, з-за чаго трэніроўкі давялося спыніць.*

**У нас ніколі не бывае манатоннай працы: сёння мы бяжым крос, заўтра — у лодку, паслязаўтра падымаем штангу — пастаянна нешта рознае, сумаваць не прыходзіцца.**

— Я наогул ніколі не падумала б, што буду займацца веславаннем, гэта было нешта нерэальнае для мяне. Заўсёды лічыла гэты від чыста мужчынскім, мне здавалася, што там усе вельмі «здаровыя дзеўкі», прабачце за выраз (*смяецца*). І гэта так складана, хоць у плаванні таксама было нялёгка. Калі я скончыла займацца ў басейне, не ведала, куды сябе падзець, таму што са спортам я была звязана заўсёды. Пачалі хадзіць з мамай у трэнажорную залу на веслярным канале, і там мяне заўважыла Ірына Алегаўна Папенка. Я прыцягнула яе погляд, таму што была высокая: у дванаццаць гадоў такая, як і цяпер. Усе думалі, што я яшчэ вырасту, але гэтага не здарылася. Раней менш за 180 см росту дзяўчат у веславанне не бралі, а я — 172 сантыметры. Ірына Алегаўна падышла да мяне і прапанавала займацца акадэмічным веславаннем. Я адказала, што ў іх там усе вялікія і я туды не пайду. Яна зняла плашч і кажа: «Паглядзі на мяне, у мяне дрэнная постаць?» Ёй на той момант было сорак з невялікім гадоў, я не змагла нічога запярэчыць, таму што яна сапраўды вельмі стройная, прыгожая, высокая. Я вырашыла паспрабаваць, і мне спадабалася. У нас ніколі не бывае манатоннай працы: сёння мы бяжым крос, заўтра — у лодку, паслязаўтра падымаем штангу — пастаянна нешта рознае, сумаваць не прыходзіцца.

***— Як вядома, пераход з юнацкага спорту ў дарослы у многіх спартсменаў праходзіць вельмі складана. Цябе гэта ўжо закранула?***

— На міжнародным узроўні ў дарослых спаборніцтвах я яшчэ не выступала. Сярод дарослых на рэспубліканскім узроўні я ведаю тых дзяўчат, якія выступаюць на сур'ёзных сусветных турнірах. І мне здаецца, я не адстаю ад іх. Вядома, гэты пераход будзе вельмі цяжкім і для мяне. На дарослым узроўні канкурэнцыя нашмат вышэйшая, магчыма нават, што гады два я буду сядзець без медалёў (не хацелася б, вядома, такога развіцця падзей, таму я буду старацца), але гэта будзе вельмі цяжка.

*Пасля юнацкай Алімпіяды ў Нанкіне Крысціна прыняла ўдзел у Кубку Беларусі, дзе сабрала ўвесь камплект узнагарод: золата ў «чацвёрцы», серабро ў «двойцы» і бронзу ў «васьмёрцы». А таксама ў чэмпіянаце свету сярод студэнтаў у Францыі, дзе ў пары з Таццянай Клімовіч заняла другое месца.*

***— Які фармат гонак табе падабаецца больш — адзіночкі або ў «двойцы», «чацвёрцы»?***

— Наогул я заўсёды любіла адзіночку, але гэта вельмі цяжка і фізічна, і маральна. Паспрабавалі ў двойцы з Таццянай, і мне спадабалася. У адзіночцы ты ведаеш, што ўсё залежыць толькі ад цябе, ніхто не падвядзе. Калі перамагаеш, то гэта толькі твая перамога. Але і ў камандзе таксама добра, калі перамагаеш — атрымліваеш задавальненне ад таго, што мы зрабілі гэта разам. У кожным відзе ёсць і свае плюсы, і мінусы, зусім розная псіхалогія.

***— Падчас дыстанцыі паспяваеш пра што-небудзь думаць?***

— Калі няма асаблівай барацьбы, можа, пра што-небудзь і паспяваеш падумаць. Але вось у гэтым фінале на Алімпіядзе я думала толькі пра тое, што павінна выйграць для краіны, успамінала, што шмат людзей мне пісалі, калі было цяжка. У астатніх выпадках звычайна думаю толькі пра гонку: як дагнаць і як зрабіць так, каб не дагналі цябе.

***— Што самае складанае для цябе ў спорце?***

— Складанасці ёсць у першую чаргу ў тэхнічным плане. Мне вельмі цяжка працаваць, таму што я маленькая па росце і лёгкая па вазе. Трэніроўкі ў нас вельмі цяжкія, па 3-4 гадзіны, шмат практыкаванняў на вынослівасць. Часам цяжка пераcіліць сябе, прымусіць шмат працаваць, дзесьці пацярпець. Цяжка бывае і псіхалагічна. У мяне мама спартыўны псіхолаг, яна дапамагае мне, дае чытаць розныя карысныя кнігі. І я выбрала гэтую ж спецыяльнасць не выпадкова.

*Крысціна вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры па спецыяльнасці «Спартыўны псіхолаг». Адзначае, што вучоба ёй вельмі падабаецца і даецца лёгка. За добрыя спартыўныя вынікі дзяўчыне выдзелілі пакой у інтэрнаце. Многія выкладчыкі гатовыя дапамагаць і пры здачы сесіі, аднак спартсменка карыстаецца гэтай дапамогай не заўсёды, бо разумее: спартыўныя вынікі могуць сысці, а веды атрымліваць трэба.*

— Я пайшла вучыцца на спартыўнага псіхолага ў першую чаргу для сябе, а таксама каб у будучыні дапамагаць спартсменам. Як ні дзіўна, мне вельмі падабаецца хадзіць на пары, з задавальненнем прасядзела б там увесь год, як гэта робіць большасць студэнтаў. Паколькі з-за спаборніцтваў і трэніровак я прапускаю шмат, за тыдзень даводзіцца вучыць тое, што людзі вучылі за семестр, але я спраўляюся.

***— Чым сёння табе даводзіцца ахвяраваць дзеля спорту?***

— У першую чаргу — зносінамі з бацькамі і сябрамі. Вольнага часу няма наогул. Перад Алімпіядай, напрыклад, я трэніравалася ў рэжыме Кітая: прачыналася а 3-й гадзіне ночы, клалася спаць у 6 вечара і наогул нікога не бачыла. Я прыходжу дадому, тата яшчэ толькі снедае. Пасля трэніроўкі абедаю і кладуся спаць.

*Многія журналісты і спартыўныя спецыялісты ўжо даўно параўноўваюць Крысціну са славутай Кацярынай Карстэн. Аднак самой спартсменцы гэтае параўнанне не падабаецца.*

— Кацярына — унікальны чалавек, больш такіх людзей у Беларусі няма і наўрад ці будуць. Мне да яе ўзроўню далёка, нават да таго, якая яна была ў юніёрах. Яна была лепшая ўсюды: і ў краіне, і ў Еўропе, і ў свеце. Гэта вялікі чалавек, яе ведаюць паўсюль, яе імя ёсць у Кнізе рэкордаў Гінэса. І я не ведаю, што павінна адбыцца, каб я дасягнула яе вынікаў. Мы разам ездзілі на зборы і на спаборніцтвы. Яна вельмі добры чалавек. Як цяпер памятаю: сядзелі з ёй у аэрапорце, размаўлялі — яна трымаецца з намі на роўных, вельмі простая, хоць і мае столькі тытулаў.

***— Як ты настройваешся на гонку? Можа, у цябе ёсць нейкія асаблівыя прыкметы або талісманы?***

— У мяне ёсць сярэбраны кулончык з выявай весляра, я ўвесь час яго нашу з сабой разам з крыжыкам. Яшчэ ніколі не выходзіла на старт без іх. Купіла яго яшчэ ў 2009 годзе, калі быў чэмпіянат Еўропы ў Брэсце. Калі страшна — малюся. Пасля Алімпіяды мае сяброўкі пашылі мне ляльку, яна — мой «двайнік». Апранутая ў чырвоны камбінезон, на галаве коска са стужачкамі — вылітая я. Першы раз гэтая лялька з'ездзіла са мной на юнацкі чэмпіянат свету ў Францыю, і спадзяюся, яна паездзіць па ўсім свеце. У прыкметы не веру, таму ў мяне іх няма.

Кожны старт праходзіць па-свойму, таму рыхтуюся па-рознаму. Усё залежыць ад рангу спаборніцтваў: на рэспубліканскіх стартах мне лепш павесяліцца перад пачаткам, перад сур'ёзнымі заездамі магу засунуць у вушы навушнікі, ні з кім не размаўляць і думаць толькі пра сваё.

*Крысціна не толькі спартсменка, але і актыўны заўзятар, дзяўчыну можна заўважыць як на хакеі ў Мінску, так і на гандболе ў родным Брэсце.*

***— Што ты любіш, акрамя спорту?***

— Вельмі люблю шопінг і вышываць, хоць, напэўна, у гэта цяжка паверыць. Вышыванню мяне навучыла яшчэ бабуля, гэты занятак мяне вельмі супакойвае, люблю ўключыць які-небудзь серыял, пакласці побач арэшкі і вышываць. Тата робіць для маіх карцін рамкі і афармляе іх.

***— Пра што ты марыш?***

— Што тычыцца спорту, то, вядома, пра дарослую Алімпіяду і алімпійскі медаль, які я змагу прынесці сваёй краіне. Сёлета я ў поўнай меры адчула гэтае шчасце, калі заваёўваеш медаль не для сябе, а для сваёй краіны, якая потым табой ганарыцца. А наогул я проста хачу быць шчаслівай, каб праз пару гадоў ні пра што не шкадаваць. Хочацца, каб побач заўсёды былі шчаслівыя блізкія. І сёння ў мяне ўсё для гэтага ёсць, таму я зараз магу з упэўненасцю сказаць, што шчаслівая: у мяне ёсць бацькі, якія мяне вельмі любяць, сябры. Я наогул не такі чалавек, які ўвесь час ные і кажа, што ўсё дрэнна.

**Я вельмі баюся захварэць на «зорную» хваробу, ведаю пару хлопчыкаў і дзяўчат, якія ўжо хворыя на яе, і гэта настолькі непрыемна, непрыгожа. Мне вельмі хочацца заставацца простым чалавекам.**

***— Што ты любіш чытаць, слухаць, глядзець?***

— Вельмі люблю Паўла Каэльё і Януша Вішнеўскага, падабаецца фантастыка, але цяпер чытанне адышло на другі план, больш займаюся вышыўкай. Фільмы люблю глядзець усе запар, пад настрой. Хочацца паплакаць — уключу меладраму, хочацца пасмяяцца — камедыю. Усё залежыць і ад кампаніі. Люблю глядзець фільмы са сваім сабакам, кладу яго побач і кажу: «Глядзі!». І ён глядзіць *(смяецца)*. Музыка таксама падабаецца абсалютна розная, пастаянна змяняецца густ. Адзінае, напэўна, што не магу слухаць — гэта рок.

***— Ты нарадзілася і жывеш у Брэсце, цяпер шмат часу праводзіш і ў Мінску. Параўнай гэтыя гарады.***

— Брэст — родны горад, адкуль я наўрад ці калі-небудзь паеду. Мінск падабаецца тым, што тут заўсёды ёсць куды пайсці, пастаянна нейкія мерапрыемствы, але не падабаецца, што ў сталіцы вельмі доўга дабірацца ад аднаго месца да другога. Па-свойму ён мне таксама падабаецца, я пабывала ўжо ў многіх краінах і магу сказаць, што Мінск нічым не саступае якому-небудзь італьянскаму Мілану. Мне наогул вельмі падабаецца Беларусь. Мінск прыгожы, а Брэст — родны! Мне здаецца, у Брэсце вельмі добрыя людзі, таму што горад вельмі спакойны. Мінск больш сучасны.

***— Што ты не любіш больш за ўсё?***

— Няшчырых людзей, ячную кашу і павукоў. Павукі — гэта самы вялікі жах у маім жыцці *(смяецца)*.

***— Чым ты захапляешся?***

— Захапляюся самымі звычайнымі рэчамі. Вось, напрыклад, што мы сядзім і проста лёгка размаўляем. Мне падабаецца, што ёсць добрыя людзі, я ўмею атрымліваць асалоду ад момантаў і атрымліваць задавальненне ўсюды, дзе можна знайсці нешта добрае.

***— У цябе ёсць дэвіз?***

— Я заўсёды кажу сабе, што ніколі не трэба здавацца і што Бог побач.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА КАСТРЫЧНІК



**2 кастрычніка, чацвер.** Добры дзень для наведвання цырульніка, асабліва ў гэтыя дні ўдаецца ўкладка валасоў.

**3 кастрычніка, пятніца.** Дзень падыходзіць для эксперыментаў з валасамі, але неспрыяльны для тых, хто хоча зрабіць звычайную нармальную стрыжку.

**4 кастрычніка, субота.** У гэты дзень лепш пазбягаць стрыжкі і іншых маніпуляцый з валасамі, інакш у выніку яны могуць выпадаць.

**5 кастрычніка, нядзеля.** Стрыжка ў гэты дзень прыцягвае няўдачу і надоўга псуе ўсе пачынанні і бягучыя справы.

**6 кастрычніка, панядзелак.** Варта ўстрымацца ад стрыжкі таксама і ў гэты дзень. Гэта дзень пасіўнасці і назірання, але ніяк не змены іміджу.

**7 кастрычніка, аўторак.** Неспрыяльны перыяд для стрыжкі валасоў, хоць і не ўплывае на іх стан. Адмоўны бок заключаецца ў тым, што слабее імунітэт чалавека.

**8 кастрычніка, серада.** Поўня і зацьменне Месяца. Не варта стрыгчыся ў дні месячнага і сонечнага зацьменняў.

**9 кастрычніка, чацвер.** Вельмі спрыяльны час для наведвання цырульніка. Валасы хутка растуць, становяцца здаровымі, не выпадаюць, менш сякуцца.

**10 кастрычніка, пятніца.** Добры час для таго, каб стварыць выдатную прычоску.

**11 кастрычніка, субота.** Дзень спрыяльны для стрыжкі і стварэння лёгкіх, паветраных прычосак.

**12 кастрычніка, нядзеля.** Спрыяльны час для стрыжкі валасоў — вы можаце атрымаць дадатковы час для жыцця.

**13 кастрычніка, панядзелак.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

**14 кастрычніка, аўторак.** Гэты час не падыходзіць для стрыжкі і стварэння прычоскі, таму што валасы непакорлівыя і формы не будзе відаць.

**15 кастрычніка, серада.** Дзень неспрыяльны для стрыжкі валасоў.

**16 кастрычніка, чацвер.** Стрыжка ў гэты дзень прынясе поспех у падарожжах і прыгажосць твару.

**17 кастрычніка, пятніца.** Самы спрыяльны час для стрыжак і прычосак.

**18 кастрычніка, субота.** Стрыжка даўжэй захоўвае форму і спрыяе росту і ўмацаванню валасоў.

**19 кастрычніка, нядзеля.** Стрыжка ў гэты дзень неспрыяльна ўплывае на здароўе галавы і вачэй.

**20 кастрычніка, панядзелак.** Вельмі спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў. Падстрыжаныя валасы даўжэй трымаюць форму і захоўваюць прыгажосць.

**21 кастрычніка, аўторак.** Выдатны дзень для афарбоўвання і стрыжкі валасоў.

**22 кастрычніка, серада.** Добры час для таго, каб стварыць выдатную прычоску. Валасы будуць хутка расці.

**23 кастрычніка, чацвер.** У гэты дзень катэгарычна не варта стрыгчыся — гэта прыцягне няшчасці.

**24 кастрычніка, пятніца.** Самы неспрыяльны дзень месяца, стрыгчы валасы не рэкамендуецца.

**25 кастрычніка, субота.** Можна стрыгчы слабыя, тонкія, ломкія, сухія валасы, Месяц абяцае зрабіць іх моцнымі, густымі.

**26 кастрычніка, нядзеля.** Вельмі добры час для стрыжкі валасоў — яна прынясе ўдачу ў прафесійных справах, дапаможа дамагчыся поспеху і сацыяльнага статусу.

**27 кастрычніка, панядзелак.** Стрыжка валасоў у гэты дзень зробіць так, што вы станеце крыху багацейшымі.

**28 кастрычніка, аўторак.** Самы лепшы дзень для наведвання цырульніка. Стрыжка прынясе добрае здароўе і роўнае спакойнае жыццё

**29 кастрычніка, серада.** Добры час для стрыжкі валасоў. Пасля стрыжкі валасы добра растуць, умацоўваюцца, набываюць здаровы бляск, знікае перхаць.

**30 кастрычніка, чацвер.** Нейтральны час для стрыжкі валасоў.

**31 кастрычніка, пятніца.** Стрыгчы валасы можна. Магічнасць гэтага дня заключаецца ў тым, што пасля стрыжкі вы можаце прыцягнуць змены ў сваё жыццё.

## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў КАСТРЫЧНІКУ

**2, чацвер,** 17.30 — 24.00
**3, пятніца,** 0.00 — 9.00
**4, субота,** 19.30 — 24.00
**5, нядзеля,** 0.00 — 10.30
**6, панядзелак,** 20.30 — 24.00
**7, аўторак,** 0.00 — 11.00
**8, серада,** 16.00 — 24.00
**9, чацвер,** 0.00 — 13.30
**11, субота,** 2.30 — 17.00
**13, панядзелак,** 19.00 — 24.00
**16, чацвер,** 0.00 — 11.30
**18, субота,** 14.00 — 23.30
**21, аўторак,** 4.30 — 12.00
**23, чацвер,** 18.30 — 22.00
**25, субота,** 18.30 — 24.00
**26, нядзеля,** 0.00 — 5.30
**27, панядзелак,** 19.00 — 24.00
**28, аўторак,** 0.00 — 12.00
**30, чацвер,** 4.00 — 15.00




**Гэтыя людзі часцей за іншых выконваюць ролю гаспадароў становішча — ці то ў прафесіі, сацыяльным асяроддзі, ці то ў сям'і. Звычайна яны дасягаюць гэтага не столькі здольнасцю адчыняць любыя дзверы ці перабольшанай агрэсіўнасцю, колькі жаданнем працаваць і ўменнем глядзець у будучыню. Людзі гэтага дня заўсёды імкнуцца мець справы з таленавітымі і рашучымі партнёрамі. Яны выбіраюць такога спадарожніка жыцця, які можа дапамагчы і зразумець іх памкненні да руху наперад. Іх прафесіяналізм бездакорны.**

## Даты | Падзеі | Людзі



**1612** год — нарадзіўся (вёска Падбярэззе, каля Віцебска) Ян Антоній Храпавіцкі, дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, аўтар дзённікавых запісаў. Сакратар караля Яна ІІ Казіміра Вазы. Актыўны ўдзельнік палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай, удзельнічаў у рабоце 24 соймаў (на 17-ці быў абраны паслом), старшыня соймаў 1665 і 1668 гадоў. Уваходзіў у шматлікія соймавыя камісіі. З 1661 года прымаў удзел у мірных перамовах з Расіяй, у падпісанні Андросаўскага перамір'я 1667 года, у перамовах 1674, 1677-78 гг. У дзённіку за 1656-85 гг. распавядае аб палітычным жыцці Рэчы Паспалітай, соймах, паўсядзённым жыцці шляхты, звычаях і норавах. Памёр у 1685 годзе.

**1754** год — 260 гадоў таму нарадзіўся Павел І, расійскі імператар (1796-1801). Сын Пятра ІІІ і Кацярыны ІІ. Праводзіў палітыку ўмацавання самадзяржаўя. Стварыў уласную яго імператарскай вялікасці канцылярыю. Узмацніў паліцэйскую апеку над прыватным жыццём усіх слаёў насельніцтва. Абмежаваў дваранскае самакіраванне, распачаў некаторыя захады па абмежаванні прыгоннага права. Паменшыў колькасць губерняў (у 1796 г. Полацкая і Магілёўская губерні аб'яднаны ў Беларускую, Віленская і Слонімская — у Літоўскую). З-за прыхільнасці да каталіцызму прыпыніў перавод уніятаў у праваслаўе, даў магчымасць каталіцызму і езуітам пашырыць свой уплыў. Заснаваў расійскія, у тым ліку ў Беларусі, камандорствы Мальтыйскага ордэна. Рэгламентаваў кіраванне і судаводства ў Беларусі па Статуце ВКЛ 1588 г. Спыніў практыку раздачы ў прыватныя рукі казённых земляў. Забіты ў выніку палацавага перавароту.

**1949** год — 65 гадоў таму нарадзіўся Барыс Мікалаевіч Жаліба, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук (1992), прафесар (1995). У 1970 г. скончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі. З 1972 года — у Беларускім тэхналагічным універсітэце, з 1997-га — у Прамбудбанку, з 2002-га — у Мінскім інстытуце кіравання. Аўтар навуковых прац па праблемах рыначнага гаспадарчага механізму, інтэнсіфікацыі і павышэнні эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці, грашова-крэдытнай палітыцы.

### Было сказана

**Тамаш ЯЎЛЕВІЧ, беларускі паэт-гуманіст, культурны і царкоўны дзеяч XVII стагоддзя:**

*«Самім прыроддзем мы навучаныя зрання*
*Мясціну помніць, скуль да нас прыйшло спрыянне,*
*І тых удзячнасцю пачціваю аддзячыць,*
*Што захацелі ў цемры талент наш убачыць».*

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.11 | 18.46 | 11.35 |
| Віцебск — | 7.11 | 18.35 | 11.24 |
| Магілёў — | 7.01 | 18.36 | 11.35 |
| Гомель — | 6.57 | 18.34 | 11.37 |
| Гродна — | 7.26 | 19.02 | 11.36 |
| Брэст — | 7.26 | 19.03 | 11.37 |

**Месяц**

***Першая квадра ў 22.32. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Іmяніны**

***Пр.*** *Ірыны, Соф'і, Барыса, Івана, Міхаіла, Уладзіміра.*
***К.*** *Дануты, Тэрэзы, Ігара, Марка.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Жонка — мужу:**
**— Што там грымнула на кухні?**
**— У мяне было прасвятленне, я бачыў будучыню!**
**— І што там, у будучыні?**
**— Мы купляем новую цукарніцу...**

Мужчына прыходзіць да ўрача:
— Доктар, у мяне пасля вяселля праблемы са зрокам.
— А менавіта?
— Я грошай не бачу.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.209. Індэкс 63850. Зак. № 3956.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 30 верасня 2014 года.